Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Натар'ны прыёмнік—з 9-й да 2½ гадз.

Неапытарыстаныя рукапісы назад аўтарам не адсылаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 месяцы — 1 р. 70 к. На 6 месяцаў — 3 р. — к. На 1 год — 6 р. — к. Выезд адносу: месяцовага — 10 к. квартальна — 30 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пакаёрай лічбы тэксту — р. 50 к. За радок пакаёрай шэрэнгі тэксту 1 р. — к. За радок пакаёрай шэрэнгі тэксту 1 р. 50 к. Сялянскія на 50 проц. дарэйш. Пасля тэксту бярэцца 10 крап. шэрэнгі.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 квадратны [illegible] За кожны далікоўны [illegible] Беспраплатн. і скарачэнні [illegible] за дакумэнт [illegible] За кожны далікоўны [illegible] Публікацыя ЗАКОНУ—6 руб. [illegible]

ПАДПІСКА КРЫМАЛЁРКА у канторы [illegible] на Усіх адпаведных Выканаўчага Выдзяленства і на Усіх [illegible] АБВЕСТКІ КРЫМАЛЁРКА [illegible] Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 283 (2471) Нядзеля, 9-га сьнежня 1928 г.

Злодзей злоўлен.

«Правда» ў перадавіцы пад загалоўкам «Держи вора» піша:

У французскім парламенце камуністычны дэпутат т. Кашэн выступіў з прамовай, дзе паведаміў шэраг бясспрэчных і ўсім вядомых фактаў, якія сьведчаць аб няўхільным імкненьні да міру працоўных СССР і іх ураду з аднаго боку, і аб сыстэматычнай падрыхтоўцы ворагамі СССР новае інтэрвэнцыі—з другога. Кіраўнік чужаземнае палітыкі Францыі Брыян палічыў патрэбным перапыніць у гэтым месцы прамову т. Кашэна рэплікамі, якія патрабуюць да сябе сур'ёзнае ўвагі, з прычыны іх буйнага палітычнага значэньня. «Польшча і Румынія не бяз трывогі адносяцца да намераў Расеі, і гэта вусім натуральна»,—сказаў Брыян.

І далей: «Польшча і Румынія жадаюць падтрымліваць выключна мірныя дачыненьні з Расеяй. Можаце быць упэўнены, што ніхто ня мае агрэсыўных замыслаў проці Расеі».

Гэтыя заявы французскага міністра замежных спраў паказальны перш за ўсё тым, што ён адкрыта і цалком бярэ на сябе палітычную адказнасьць за тое, што робіцца Польшчай і Румыніяй у адносінах да СССР. Польшча і Румынія, як яму «дасканала відома» (яшчэ-б, не) нічога, акрамя міру з СССР, не жадаюць і ня рыхтуюць. Ён нават бярэ на сябе адважнасьць заявяць, што «ніхто (?—рэдакцыя) ня мае агрэсыўных замыслаў» проці СССР.

Не пасьпела адгучэць у газэтах рэха рэплік, як зьявіліся новыя выкрываньні „выключна мірных" намераў Польшчы і Румыніі ў адносінах да СССР. Гэтыя выкрываньні ідуць з вуснаў такога аўтарытэтнага сьведкі, як «намесьнік старшыні дырэкторыі украінскае народнае рэспублікі» Лявіцкага. Выяўляецца, што на вядомай нарадзе Пілсудзкага з кіраўнікамі румынскага генэральнага штабу і з прадстаўнікамі Англіі і Францыі ў Бухарэсьце прысутнічаў і прадстаўнік «украінскага ўраду» для абмеркаваньня ўзаемадачыненьняў між польска-румынскай арміяй і «украінскім урадам», якія павінны ўстанавіць між імі, калі ўсе яны апынуцца на украінскай тэрыторыі. Выяўляецца, што запрашэньне пятлюраўскага генэрала адбылося водгук жаданьню Пілсудзкага, бо, як кажа Лявіцкі, «гэткімі выяўляюцца ўмовы нашае згоды з польскай рэспублікай».

Сьлады антысавецкае працы пятлюраўцаў прыводзяць нас ня толькі ў Варшаву, але і ў Лёндан. Дакумэнты, агалошаныя ў сучасны момант у «Абэнд», трактуюць ужо аб «цікавасьці», якую выказвае да «ўгавораў, падпісаных дырэкторыяй украінскае рэспублікі з грузінамі, дońцамі і кубанцамі», сам Чэмберлен.

Зразумела, усе крокі украінскіх белагвардзейцаў выклікаюць толькі сьмех. Але перапіска дзеячоў «украінскае дырэкторыі» прымушае нас яшчэ і яшчэ раз успомніць аб неабходнасьці быць гатовымі да самых кепскіх «выпадковасьцяў». Пан Брыян узмоцнена шукае вінаватых за ўзбраеньні і крычыць: «Трымай злодзея». Злодзея зьявілі на месцы злачынства, вось ён, можаце яго ўзяць і зьвязаць, пан Брыян, гэта—Лявіцкі з бандаю польскіх і румынскіх генэралаў і яшчэ з сім-тым, хто стаіць за іх плячыма, і каго вы, пан Брыян, ведаеце бліжэй, чымся мы.

САВЕЦКА-НЯМЕЦКІЯ ДАЧЫНЕНЬНІ.

Канцэнтрацыя дзейнасьці органаў гандлю з СССР.

БЭРЛІН, 7-12. Учора адбыўся сход «нямецка-расейскага таварыства», на якім прысутнічалі прадстаўнікі нямецкіх урадавых устаноў з нозначаным нямецкім паслом у СССР Дырксенам на чале, а таксама прадстаўнікі кіруючых аб'яднаньняў нямецкіх прадпрыемцаў.

Сход ухвалі: «дзеля рацыяналізаваньня і ўстанаўленьня аднаўзорнасьці ў распрацоўку ўсіх пытаньняў, якія датычаць расейскіх спраў, згадзіцца на ўстанаўленьне суцольнае працы нямецка-расейскага таварыства і цэнтру, заснаванага намітэтам па расейскіх справах, які быў створан нямецкімі гаспадарчымі коламі".

Гэтая пастанова мае на меце заснаваць адпаведную ўстанову для ўсяе Нямеччыны, якая выступіла-б ад усіх нямецкіх гаспадарчых колаў; у абавязкі гэтае ўстановы будзе ўзаходзіць кансультаваньне колаў зацікаўленых у зьдзелках з СССР.

„САВЕЦКА-НЯМЕЦКІЯ АДНОСІНЫ—РАШАЮЧАЯ СУСЬВЕТНАЯ ПРАБЛЕМА".

БЭРЛІН, 7-12. На сходзе памяці нябожчыка нямецкага посла ў Саюзе Брокдорфа-Ранцау, наладжаным таварыствам вывучэньня Эўропы, вядомы знаўца міжнароднае палітыкі прафэсар Хэтч заявіў аб сваёй салідарнасьці з заявай „Известий", што да савецка-нямецкіх дачыненьняў нельга падыходзіць, як да выключна практычнае штодзённае праблемы, а што гэтыя дачыненьні належыць разглядаць, як рашаючую сусьветную праблему, бо гэтага вымагае становішча Нямеччыны, якая знаходзіцца між Усходам і Захадам.

Запавет нябожчыка Брэкдорф-Ранцау.

БЭРЛІН, 7-XII. На ўрачыстым пасяджэньні ў Берліне, прысьвечаным памяці нябожчыка, нямецкага посла ў СССР Брэкдорфа-Ранцау, паўнамоцны прадстаўнік СССР у Берліне Красьцінскі зачытаў ліст, які брат нябожчыка паслаў, згодна яго даручэньня, Чычэрыну.

У гэтым лісьце зазначана:

„На думку дактароў Брэкдорф павінен быць падрыхтаваны да рашоўнае сьмерці ў любы момант. Перад сьмерцю ён даручыў свайму брату перадаць Чычэрыну ці Літвінаву, што ён лічыў задачаю свайго жыцьця давесьці да належнага канца палітыку, якую ён праводзіў на пранягу апошніх 6-ці гадоў. Ён выказвае ўдзячнасьць ім абодвым, асабліва-ж Чычэрыну, за тое давер'е і супрацоўніцтва, якое ён заўсёды сустракаў. Яго апошняя надзея, што нямецкі і расейскі народы ажыцьцёвяць супольную працаю тую мэту, да якое ён імкнуўся».

Скандал на фоне парыскіх будняў.

Машэньніцкае акц. т-ва пры рэдакцыі „Газэт дю Франк".

УДЗЕЛЬНІКАМІ ЖУЛЬНІЦКАГА Т-ВА ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА І СЯБРЫ ЎРАДУ ПУАНКАРЭ.—ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ПАЦЯРПЕЛА НА ШМАТ МІЛ. ФРАНКАЎ

ПАРЫЖ, 6-12. Агэнцтва Гаваса паведамляе, што паліцыя канфіскавала ў памяшканьні рэдакцыі «Газэт дю Франк» на 300 тысяч франкаў акцый маленьніцкага акцыянэрнага таварыства, заснаванага дзеячамі гэтае газэты, Жыхары Эльзасу страцілі 4 міліёны франкаў у выніку ўчынкаў афэрыстаў.

* * *

ПАРЫЖ, 6-12. Вобыск у шмат-якіх прадпрыемствах агэнтурах „Газэт дю Франк", якія займаліся разьмяшчэньнем акцыяцкай стварэньні навалок газэты дутых фінансавых прадпрыемстваў, выявіла, што ў прадпрыемствах разьмяшчаліся абавязацельствы гэтых кампаній на міліённыя сумы. Да сьмяхотных момантаў гэтае справы трэба адмесьці выкрытыя даданьнем спробы заснаваць пры газэце таварыства дзеля распаўсюджваньня набажэнства па радыё і кіно-кампанію дзеля распаўсюджваньня рэлігійных фільмаў.

„Юманіта" паведамляе падрабязнасьці аб супрацоўніках „Газэт дю Франк". Да гэтых супрацоўнікаў належалі амаль-што ўсе міністры габінэту нацыянальнае адзінасьці і шэраг вядомых палітычных дзеячоў, асабліва з лева-буржуазных партый. Газэта аднаўляе ў памяці таксама нумар газэты з факсыміле артыкулу Пуанкарэ.

„Юманіта" ганьбіць паводзіны сацыяліста Шахтане, які падаў запытаньне ўраду наконт гэтае афэры і паправдзіў, што яму вядомы імёны сяброў ураду, замешаных у афэры, але, пад вопраскі ўсае палаты, апроч камуністаў, заявіў, што паведаміць гэтыя імёны толькі Пуанкарэ, якому ў даным выпадку цалкам даверае.

* * *

ПАРЫЖ, 7-12. Агэнцтва Гаваса паведамляе: «Судовая ўлада загадала арыштаваць палітычнага кіраўніка „Газэт дю Франк" Адыбэра. Загад ня выканан, бо ў Адыбэра хворае сэрца, і ён лечыцца ў сябе дома».

АНГЕЛЬСКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ Ў АУГАНІСТАНЕ.

ПАЎСТАНЬНЕ РЭАКЦЫЯНЭРАЎ ШЫРЫЦЦА.

ТЭРМЭЗ (На аўганскай мяжы), 5-12. Рух поўстаўшага на аўгана-індыйскай мяжы племя шыквары пашыраецца. Часткова захоплен Жальлялябат. Падышах абвясьціў нарадную вайну проці рэакцыйнага руху, які ўзьнімаецца пры дапамозе сіл, варожых Аўганістану. Спроба паўстанцаў пасунуцца на паўднёвы захад ад Жалалялябату па Кабульскім шляху, была рашуча прыпынена ўрадавым войскам. Есьць весткі, што на мяжы ў райёне паўстаньня зьявіўся Міа-ан-Гуль (уладарны хан сумежнага з Аўганскім княствам Сват) і ангельскі палкоўнік Лаўрэнц, які добра вядомы мусульманскаму сьвету, як арганізатар інспіраванага ангельцамі антытурэцкага паўстаньня арабаў у часе сусьветнае вайны.

Беспардонная мана.

Паведамленьне ТАСС.

Водлуг атрыманых ТАСС вестак, паведамленьне румынскае прэсы, нібыта ў Васэрмане адбылося 25-га лістапада пасяджэньне мешанае савецка-румынскае камісіі, зусім не адпавядае сапраўднасьці. Камісія ня зьбіралася на працягу лістапада, і агалошаная ў румынскай газэце «Дэмінэца» падрабязная справаздача пасяджэньня, якое нібыта адбылося ў Васэрмане, выдумана ад пачатку да канца.

4-ая СЭСІЯ ЦВК СССР.

АГУЛЬНЫЯ АСНОВЫ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ І ЗЕМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ.

КОЖНЫ КАВАЛАЧАК ЗЯМЛІ МУСІЦЬ БЫЦЬ ГАСПАДАРЧА ВЫКАРЫСТАН.

Пераход на шырокія палосы, барацьба з дальнязямельнасьцю і праспалосіцаю, умацаваньне калектыўных гаспадарак і скарачэньне выхаду на адрубы і хутары—вось асновы нашага земляўпарадкаваньня.

Даклад тав. Мілюціна.

МАСКВА, 7-XI. На ранішняе пасяджэньні 7-га сьнежня сэсіі ЦВК СССР заслухала даклад Мілюціна аб агульных пачатках земляўпарадкаваньня і землякарыстаньня ў СССР.

Тав. Мілюцін нагадвае, што трэцяя сэсія ЦВК СССР, заслухаўшы даклад наконт праекту новага закону аб агульных пачатках земляўпарадкаваньня і, землякарыстаньня, прапанавала прэзыдыуму ЦВК перадаць праект на папярэдняе абмеркаваньне рабочым і сялянам мясцовых саветаў і савецкіх грамадзкіх арганізацый. Цяпер прэзыдыум ЦВК ужо мае зялёную колькасьць паправак, паданых савецкаю грамадзкасьцю. Па РСФСР зроблены заўвагі да праекту 14 губерніі і 4 вобласьцяні. Таксама шырока абмяркоўвася праект закону на Украіне, Урале, Беларусі і іншых рэспубліках і абласьцёх СССР.

Агульныя вывады ўсіх паданых да праекту заўваг зводзяцца да двух палажэньняў. Вёска патрабуе ўстойлівага землякарыстаньня. Веска патрабуе каб кожны кавалачак зямлі быў гаспадарча выкарыстан. Гэтыя вывады маюць надзвычайна вялікае значэньне, бо яны вызначаюць настрой серадняцкае асноўнае масы.

Мілюцін адзначае, што земляўпарадкаваньне вядзецца павольным тэмпам, не пасьпяваючы нават за агратэхнічнымі мерапрыемствамі. Да гэтага часу у СССР земляўпарадкавана толькі 30-40 процантаў усяго зямельнага абшару. У шмат якіх заўвагах з вёскі зазначаецца, што земляўпарадкаваньне хутароў і адрубоў праводзіць не належыць. Цэнтр не праводзіць зараз гэтае лініі. Асноўная тэндэнцыя зводзіцца да земляўпарадкаваньня шырокіх палос, паселкавых і калектыўных гаспадарак. Асноўны працэс земляўпарадкаваньня—гэта пераход на шырокія палосы і барацьба з дальнязямельнасьцю, праспалосіцаю, умацаваньне калектыўных гаспадарак, скарачэньне выхаду на адрубы і хутары.

Гэты працэс ідзе з нізоў, паўнасьцю адпавядаючы асноўнаму напрамку ў палітыцы савецкае ўлады. Трэба спрасьціць спосабы земляўпарадкаваньня але ажыцьцёвіць яго хоць-бы ў грубых рысах.

Далей Мілюцін пераходзіць да разгляду паправак да асобных артыкулаў закону.

Нацыяналізацыя зямлі, скасаваньне прыватнае ўласнасьці на зямлю, устанаўленьне па яе выключна дзяржаўнае ўласнасьці савецкіх рэспублік зьяўляецца мерапрыемствам, якое ужыта ў інтарэсах асноўнае масы сялянства-беднякоў і сераднякоў. Гэтае палажэньне супярэчнасьці не сустракае. Вёска клапоціцца толькі, каб зямля выкарыстоўвалася выключна працоўнымі. Драпежніцкае карыстаньне павінна пазбаўляць права на зямлю. Чуюцца просьбы не дапушчаць зямельных падзелаў. Наконт гэтага Мілюцін зазначае, што дзяржава на можа забараняць вызделаў і падзелаў.

З падзеламі зямлі трэба змагацца эканамічнымі мерапрыемствамі.

Папраўкі гэтыя, адзак, каштоўны, як выяўленьне пэўных адносін сялянскіх мас да зямельных падзелаў. Арт. 13 закону адчыняе шырокія магчымасьці для ўпарадкаваньня на месцах пытаньня аб падзелах, з папярэджаньнем проці надзвычайнага драбленьня гаспадарак.

Пераходзячы да земляўпарадкаваньня, Мілюцін зазначае, што закон устанаўляе вольны выбар форм землякарыстаньня—і калектыўных форм, і адрубоў. Абмежваць волю выбару нельга. Гэта ня значыць, што мы павінны пасьпяшаць адносіцца да гэтага пытаньня. Мы павінны праводзіць пэўны напрамак да ўзбуйненьня сельскае гаспадаркі, яе калектывізацыі. Аднак, прымус тут ня можа мець месца. Непажаданыя формы землякарыстаньня можа адзначыць толькі сама сялянская грамада, а яна, як зазначаюць папраўкі, настроена на карысьць калектыўных форм.

Шмат сур'ёзных паправак спаткаў арт. 29 пятага разьдзелу наконт захадаў для падахвочваньня да калектыўных і іншых таварыскіх форм. Гэтыя папраўкі павінны быць узяты пад увагу. Усе яны вядуць да стварэньня моцнае ўстойлівасьці калгасаў, а для гэтага трэба стварыць цьвёрдую вытворчую базу.

Шмат заўваг выклікаў арт. 37 наконт арэнды зямлі працоўнага карыстаньня. Чуюцца пажаданьні скарацець арэнду і нават забараніць яе. Гэта было-б няправільным і пашкодзіла-б незаможнай частцы вёскі. Трэба сачыць, аднак, каб арэнда не пераходзіла ў формы закабаленьня. Парадкаваць арэндныя адносіны павінны сельсаветы.

Далей Мілюцін спыняецца на праекце артыкулу закону аб узаемадачыненьнях між зямельнаю грамадою і сельсаветамі. Галоўная роля ў вёсцы павінна належаць сельсавету, як правадніку савецкае палітыкі. Сельсавет павінен узяць у свае рукі кіраваньне зямельнаю дзейнасьцю. Зямельная грамада павінна быць захавана, як гаспадарчая адзінка ў вёсцы і павінна быць толькі ўзмоцнена гаспадарчая сувязь між ёю і сельсаветам. Рэгулюючая роля апошніх павінна быць узмоцнена. Арт. 47 Агульных Асноў гаворыць аб вытворчых задачах зямельнае грамады і мерапрыемствах у галіне вытворчага каапераваньня і калектывізацыі, якія можна ажыцьцёвіць. Шэраг зямельных грамад у нас фактычна ўяўляюць сабою форму таварыства або хаўрусу. Шмат асобных зямельных грамад пераходзіць на грамадзкую апрацоўку зямлі. У склад грамады ўваходзяць усе, хто займаецца сельска-гаспадарчаю вытворчасьцю на тэрыторыі грамады. Сябрам грамады зьяўляецца ня толькі гаспадар двара, але і ўсе члены двара, а таксама і сельска-гаспадарчы пралетарыят, які жыве на тэрыторыі данае грамады. Безазямельныя сябры грамады надзяляюцца зямлею ў парадку, які ўстанаўляецца законадаўствам СССР.

Некаторыя папраўкі кажуць, каб надаць права на зямлю настаўнікам і аграномам. Бясспрэчна, кажа Мілюцін, што калі агранам зьвязан з сельска-гаспадарчаю вытворчасьцю на тэрыторыі грамады, дык яму можа быць надзелена зямля. Практычна так і праводзіцца.

Надзяленьне сельска-гаспадарчага пралетарыяту зямлёю зьяўляецца зусім новым палажэньнем у законе. Наш закон шчыльна зьвязан з усёю сыстэмаю мерапрыемстваў у галіне ўзьняцьця і перабудовы сельскае гаспадаркі. На гэтую сувязь павінна быць зьвернута ўвага сэсіі.

Перад намі пытаньне, як пашырыць сельска-гаспадарчую вытворчасьць. Галоўнаю ўмовай для разьвязаньня гэтае задачы зьяўляецца вытворчая дапамога сельскай гаспадарцы, палепшаньне яе тэхнікі самім сялянствам праз скарыстаньне машын, угнаеньняў, палепшаных спосабаў апрацоўкі зямлі, праз мабілізацыю ўласных сродкаў сялянства. Задачы ўзьдыму сельскае гаспадаркі вырашаюцца ў сувязі з індустрыялізацыяй краю. Чым мацней разьвіцьцё прамысловасьці, тым вышэй будзе ўзровень сельскае гаспадаркі. Гэтую сувязь сялянства павінна зусім выразна ўцяміць. Разам з гэтым трэба згуртаваць максымум увагі на якасьці с.-г. вытворчасьці і ўраджайнасьці нашага поля. Уся сыстэма палепшаньня сельскае гаспадаркі павінна быць увязана з земляўпарадкаваньнем. У нашым Саюзе 25 міліёнаў індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Галоўны шлях палепшаньня індывідуальных гаспадарак—праз каапэрацыю. Працуючы над палепшаньнем індывідуальных гаспадарак, мы ні на хвіліну не павінны заплюшчваць вочы на разьвіцьцё буйных калектыўных гаспадарак. Зрух вёскі ў бок калектывізацыі мы нагляднаем штодня. Трэба падтрымаць гэты зрух. Выразнае разуменьне гэтых задач дапаможа іх лёгка вырашыць.

Пасяджэньне зачынілася.

На вячэрнім пасяджэньні—даклад ураду Узьбецкае ССР.

У Саюзных Рэспубліках.

Паказальная фабрыка збожжа ў Данбасе

РАСТОЎ-ДОН. 6-XII. Адбываецца ўзмоненая падрыхтоўка да заснаваньня ў Данской акрузе Паказальнае збожжавае савецкае гаспадаркі. Ужо скончана дасьледаваньне глебы на абшары будучае гаспадаркі. Хутка скончацца гідратэхнічныя адшуканьні.

Савецкая гаспадарка будзе знаходзіцца недалёка ад разьезду Вярблюд Данецкае чыгункі (між Кагальніцкаю і Мячэцінскаю станцыямі). Абшар, які зойме гаспадарка, дасягае 50.000 гэктараў. Пры савецкай гаспадарцы будзе пабудаваны гарадок для служачых. У гарадку будуць мэханічныя майстэрні, гаражы для трактараў і навуковыя лябараторыі. Жыхарства гарадку будзе дасягаць тысячы чалавек.

ПЕРШЫЯ ВЕСТКІ З ПЕРАВЫБАРЧАГА ФРОНТУ.

ЧЫТА, 7-XII. Распачаліся перавыбары гарадзкіх і сельскіх саветаў. У пераабраных 59-ці сельсаветах 66 проц. беднякоў, 30 проц. сераднякоў, рэшта—заможныя. Большасьць старшыняў—беднякі. Удзел выбаршчыкаў дасягае 70 проц.

* * *

БАКУ, 8-XII. У Джабрыяльскім павеце, дзе распачаліся ўжо перадвыбарчыя сходы беднаты, кулакі пачалі цкаваць батракоў, якія наведваюць гэтыя сходы. За тыдзень здарылася пяць выпадкаў абойства батракоў кулакамі.

* * *

ТАШКЕНТ, 8-XII. Справаздачна-перавыбарчая кампанія распачынаецца 10 сьнежня. Весткі з месц сьведчаць пра слабую падрыхтаванасьць да перавыбараў саветаў. Вясковая беднота выказвае вялікую актыўнасьць у падрыхтоўцы да перавыбараў.

ІНІЦЫЯТЫВА СМАЛЕНЦАЎ ПАДХОПЛЕНА РАБОЧЫМІ ПАВАЛОЖЖА

КАЗАНЬ, 8-XII. Рабочыя заводу «Красный Восток» выклікаюць рабочых іншых прадпрыемстваў на спаборнітвы па падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў. Рабочыя заводу „Спартак" згадзіліся на выклік і пачалі дзейна рыхтавацца да перавыбараў. Самы буйны ў краі завод № 40 выклікае рабочых «Красного Металлиста». Туды выяжджае дэлегацыя заводу, каб азнаёміцца з падрыхтоўкаю да перавыбараў.

Дапамога мэталёўцаў СССР Рурскім братом па класе.

МАСКВА. Прафінтэрн і ЦК мэталёўцаў СССР пераслалі цэнтральнаму стачачнаму камітэту 25 тысяч марак на дапамогу рабочым, якія ня ўзяты на працу пасьля сканчэньня лёкауту ў Рэйнска-Вэстфальскай вобласьці.

„Змова рэфармістаў і капіталістаў проці перадавых рабочых,—зазначана ў тэлеграме пры перасылцы,—дорага абойдзецца і іншым».

Культурнае сьвята

100 ГОД ТЭХНОЛЁГІЧНАГА ІНСТЫТУТУ ІМЯ ЛЕНІНГРАДСАВЕТУ.

МАСКВА. 10-га сьнежня—стагодзьдзе з дня заснаваньня Тэхналёгічнага Інстытуту ў Ленінградзе імя Ленінградзкага Савету. Інстытут правёў вялікую навуковую і культурную працу. Каб адзначыць юбілей Інстытуту, прэзыдыум ВСНГ СССР хадайнічае перад прэзыдыумам ЦВК узнагарадзіць Інстытут Орданам Чырвонага Працоўнага Сьцягу і прысвоіць званьне заслужоных дзеячоў навукі найстарэйшым прафэсарам Інстытуту—Воранаву, Гатпуку і Якаўкіну. Ухвалена ўстанавіць у Інстытуце 5 стыпэндый імя У. І. Леніна для вылучэнцаў (па 150 р. у месяц.)

10 гадоў Вайсковае Акадэміі імя Фрунзэ.

МАСКВА. У зьвязку з 10-мі ўгодкамі (8-га сьнежня) Вайсковае Акадэміі імя Фрунзэ, агалошан загад за подпісам тав. Варашылава. Загад адзначае выдатныя заслугі Акадэміі ў справе падрыхтоўкі чырвоных спэцыялістаў.

«Вайсковая Акадэмія,—зазначана ў загадзе,—паступова робіцца сапраўдным цэнтрам марксыцкае вайсковае навуковае думкі. Рэвалюцыйны Вайсковы Савет выказвае ўпэўненасьць, што Акадэмія з посьпехам выканае задачы, якія стаяць перад ёю і забясьпечыць Чырвоную армію кваліфікаванымі камандзірамі, якія адпавядаюць узроўню сучасных патрабаваньняў вайсковае справы і захоўваюць лепшыя традыцыі грамадзянскае вайны».

Савецкія гаспадаркі індустрыялізуюцца.

ОМСК, 6-XII. У самай буйнай сібірскай савецкай гаспадарцы Эліта пушчана першая ў Сібіру фабрыка для ачысткі збожжа, якая прапушчае 300 цэнтнэраў збожжа ў суткі.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Пілсудчына не жадае міру.

ЛЬШ БУРЖУАЗНАГА ПАЦЫФІЗМУ ВЫКРЫТА КАМФРАКЦЫЯЙ СОЙМУ

ВАРШАВА, 7-12. (Затрымана дастаўкаю). 6-га сьнежня ўрад падаў у сойм на зацьверджаньне падпісаную Польшчаю міжнародную канвэнцыю аб наглядзе над гандлем зброяй і аб забароне газавае вайны. Дакладваў канвэнцыю пэпэсавец Чапінскі.

Ад імя камфракцыі дэпутат Цыбула зачытаў дэклярацыю, у якой між іншым зазначана: «Канвэнцыя, якую прапануе сойму зацьверджаць адзін з лідэраў ППС, зьяўляецца аднэю з праяў фальшыва пацыфісцкае кампаніі міжнароднае буржуазеі і яе агентаў з 2-га Інтэрнацыяналу. Калі-б міжнародная буржуазія сапраўды жадала міру, а не правакавала вайну, дык яна не адхіліла-б прапаноў Літвінава, які паставіў пытаньне аб разброеньні на рэальны грунт. Калі-б урад, ад імя якога Залескі прапануе зацьвердзіць канвэнцыю, сапраўды жадаў міру, дык ён даўно ўхваліў-бы пакт аб ненападзе, які нараз прапанаваў савецкі ўрад».

ПЕРАГЛЯД ПОЛЬСКАЕ КАНСТЫТУЦЫІ.

ВАРШАВА, 7-12. Канстытуцыйная камісія сойму ўхваліла рэзалюцыю, прапанаваную пілсудчыкамі, што „сойм распачынае перагляд канстытуцыі».

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ БЕЛАРУСАЎ.

ВАРШАВА, 7-XII. «Кур'ер Поранны» паведамляе, што ў Навагрудзкім ваяводзтве арыштавана блізка 100 беларусаў, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасьці.

Абвінавачаньне не па адрасе.

ВАРШАВА, 7-XII. (Затрымана в прычыны пасаваньня лініі). Орган пілсудчыкаў «Глос Правды» асуджвае старшыню ЦВК СССР Пятроўскага за яго спатканьне з украінскай дэлегацыяй, якая скардзілася па прыгнечаньне украінцаў у Польшчы. Асабліва не палабаецца афіцыёзу тое, што Пятроўскі абяцаў дэлегацыі ватрабаваць ад Польшчы дыпляматычным парадкам выкананьня 7-га арт. Рыскага ўгавору. На думку газэты, выступленьне Пятроўскага зьяўляецца ўмешаньнем ва ўнутраныя справы Польшчы.

ЗАЎВАГА: Як відаць, „Глос Правды" мае на ўвазе адказ Пятроўскага на сэсіі Усеукраінскага ЦВК на інтэрпэляцыю мёўскае дэлегацыі да ўраду УССР наконт парушэньня Польшчаю арт. 7 Рыскага ўгавору.

Рэакцыя вітае рэакцыю.

ВАРШАВА, 7-11. Дэлегацыя расейскіх эмігрантаў прывітала югаслаўскага пасланьніка ў Варшаве з 10-мі ўгодкамі Югаславіі. На чале дэлегацыі былі Рыманскі і Вайцахоўскі, брат бела-эмігранта, які ўчыніў замах на гандлёвага прадстаўніка СССР тав. Мізарава.

Сацыялістычная прамысловасьць вытрымала экзамен.

Першая газа па нафтаправодзе Грозны—Туапсэ.

МАСКВА. Пачаў працаваць нафтаправод Грозны—Туапсэ. Кіраўнік Азнафты Ганшын паслаў старшыні СНК СССР т. Рыкаву тэлеграму, што «5 сьнежня а 22 гадз. 40 хв. пачала перадавацца ў Туапсэ газа, якая перакачваецца па нафтаправоду. Пры перакачцы газы страты, а таксама парывоў па лініі, ня было. Нафтаправод пачаў працаваць у час, назначаны ўрадам. Выдаткі па пабудове нафтаправоду не перавысілі кашторысу. Перакачка газы адбываецца далей».

Прывітаньне тав. Рыкава будаўнікам нафтаправоду.

У адказе тав. Рыкава зазначана: „Вітаю рабочых і інжынэрна-тэхнічны склад са сканчэньнем будаўніцтва і пускам у эксплёатацыю нафтаправоду Грозны—Туапсэ. Нафтаправод пабудован ўласнымі сіламі новае прамысловасьці і нашае тэхнікі і пушчан у ход без вялікага спазьненьня. Яго пабудаваньне мае ня толькі вялічэзнае эканамічнае значэньне, але зьявілася адначасна экзаменам для нашае прамысловасьці і тэхнікі. Экзамен на новым фронце будаўніцтва вытрыман, прычым вытрыман без затраты асабліва вялікіх сродкаў. У гэтым вялікая заслуга будаўнікоў нафтаправоду Грозны—Туапсэ».

Брацкае яднаньне 36 нацыянальнасьцяй

Заключнае пасядж. рабселькораўскае нарады

ДАКЛАД МАНДАТНАЕ КАМІСІІ.

МАСКВА. На пасяджэньні нарады рабселькораў 7 сьнежня ўхвалены рэвалюцыі 17 сэкцый і камісій, якія распрацоўвалі асноўныя пытаньні рабселькораўскага руху.

Заслухан таксама даклад мандатнае камісіі. На нарадзе прысутнічае 746 чалавек. Упяршыню на рабселькораўскай нарадзе прысутнічае 12 чужаземных дэлегатаў. З правам рашаючага голасу—447 дэлегатаў. У складзе прысутных—5 проц. рабочых, 7 проц. батракоў, 20 проц. сялян, 9 проц. служачых, 7 проц. вайскоўцаў і 12 проц. жанчын-дэлегатак.

На нарадзе прысутнічаюць прадстаўнікі 36 нацыянальнасьцяй.

Сяброў партыі сярод дэлегатаў 57 проц., кандыдатаў—12 проц. Селькоры па сацыяльным становішчы зьяўляюцца, пераважна, беднатою—75 пр. Ёсьць некалькі сяброў камун і калгасаў.

На вячэрнім пасяджэньні з вялікаю прамовай выступіў Варашылаў.

ВЫНІКІ КОНКУРСУ НА ЛЕПШУЮ ЗАМЕТКУ ДЭЛЕГАТАЎ.

Прадстаўнік чужаземных рабкораў Фрыдрых паведаміў пра вынікі конкурсу на лепшую заметку, праведзенага сярод дэлегатаў. Пададзена 102 лісты; 5 лістоў атрымалі прэміі; самымі лепшымі зьяўляюцца лісты селькорці Сатурыц (Украіна), якая напісала пра калектыўную гаспадарку, і селькора Ненеца (Казакстан), які напісаў пра становішча перасяленцаў у Сібіры за царом і пры савецкай уладзе. Усе 5 лепшых заметак атрымалі ў прэмію падарожжа па СССР.

Далей нарада абрала рэдакцыйную калегію часопісі «Рабоча-Крестьянский Корреспондент» у складзе Ульянавай, Інгулава і інш., а таксама некалькіх селькораў.

Нарада зьвярнулася з прывітаньнем да ЦК УсеКП(б), выканкому Камінтэрну, ЦВК СССР, Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР і да Максіма Горкага.

НАРАДА ЗАЧЫНІЛАСЯ.

Зачыняючы нараду Ульянава заявіла, што гэта першая ўсесаюзная нарада рабселькораў, дзе так паўна былі прадстаўлены ўсе нацыянальнасьці. Ад імя ўсяе нарады Ульянава перадала шчырае прывітаньне чужаземным рабкорам, якія ўпяршыню прысутнічаюць на нарадзе.

ПАРАЖЭНЬНЕ ЧЭХАСЛАВАЦКАГА ЎРАДУ НА МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАХ.

КАМУНІСТЫ—НА ДРУГІМ МЕСЦЫ ПА ЛІКУ АТРЫМАНЫХ МАНДАТАЎ.

ПРАГА, 6-XII. Водлуг канчатковых даных, на выбарах у ляндтагі Багеміі, Маравіі, Прыкарпацкай Русі і Славакіі ўрадавая каліцыя атрымала 83 мандаты, апазіцыя—85, у тым ліку камуністы—21, заняўшы другое месца.

Стачка-паўстаньне ў Калюмбіі.

НЬЮ-ЁРК, 7-XII. З Калюмбіі паведамляюць, што забастоўка рабочых бананавых плянтацый на спыняецца.

Улада ўстанавіла суровую цэнзуру над усімі паведамленьнямі пра забастоўку. Аднак, відома, што здарыліся стычкі між бастуючымі і войскам, пасланым дзеля «аховы парадку» ў райён забастоўкі.

Ні міністэрства замежных спраў Злучаных Штатаў, ні місія Злучаных Штатаў у Калюмбіі на выказваюцца наконт забастоўкі. Паўночна-амэрыканская асацыяцыя Лігі Барацьбы з Імпэрыялізмам і прыгнечаньнем калёніяльных народаў зьвярнулася па тэлеграфу да калюмбійскае сэкцыі лігі з заклікам наладзіць барацьбу са спробаю паўночна-амэрыканскіх капіталістаў выкарыстаць забастоўку, як прычыну для скараканаваньня інтэрвэнцыі Злучаных Штатаў у Калюмбіі.

Новы наступ рэакцыі на Беларускую меншасьць у Латвіі.

Выбары ў новы латвійскі сойм, якія адбыліся ў кастрычніку, ня прынесьлі ніякага палепшаньня для беларускае меншасьці. Праўда беларусам удалося па сьпіску сацыял-дэмакратаў правесьці аднаго свайго дэпутата (Уладзімера Пігулеўскага, кіраўніка Беларускага аддзелу пры міністэрстве асьветы), але гэты адзіны дэпутат на руках і на нагах зьвязаны і эс-дэкаўскай палітыкай і сваім службовым становішчам у міністэрстве асьветы, а таму вось ужо ў працягу двух месяцаў ён ані пікнуў у сойме аб патрэбах беларускага сялянства і рабочых. Два месяцы працуе сойм, а беларускі дэпутат яшчэ ніводнага разу ня выступіў. Відаць, і ў далейшым ён у гэткі-ж спосаб будзе «абараняць» інтарэсы беларускае меншасьці.

Тым часам, калі ня можна чакаць палепшэньня становішча беларусаў у Латвіі, дык ужо зусім ясна магчыма адзначыць яскравае пагоршаньне праўнага становішча беларускае меншасьці.

Пачалося з таго, што латвійская рэакцыя адразу-ж распачала новы наступ супроць беларускае школы і школьных дзеячоў. Першым актам было скарачэньне бюджэту на ўтрыманьне беларускіх школ у бягучым 1928-1929 навучальным годзе. У выніку гэтага скарачэньня беларусы не змаглі ў гэтым годзе адчыніць ў Рызе беларускую гімназію, адчыненьне якой падрыхтоўвалася ўжо два гады, і канцэсія на адчыненьне якой была атрымана яшчэ пры міністру асьветы Яне Райнісе-Плескшане.

Другім вынікам скарачэньня бюджэту было тое, што ў Рызе беларусы павінны былі адмовіцца ад адчыненьня беларускага дзіцячага саду, падрыхтоўчая праца да адчыненьня якога праводзілася ўсё лета і была ўжо ўсім закончана.

Гэткім-жа спосабам правалена была справа адчыненьня беларускага дзіцячага саду ў Дзьвінску.

Такім чынам, беларусы да гэтага часу ня маюць ў Латвіі ніводнага беларускага дзіцячага саду.

Ніякія довады аб тым, што беларусам патрэбна пакінуць той бюджэт, які ўжо быў беларусам прызначаны пастановаю ранейшага сойму, ня мелі памысных вынікаў. Беларускі бюджэт быў скарочаны, і тры новыя беларускія школы, якія павінны былі ў гэтым годзе адчыніцца, не адчыніліся. Рэакцыйны міністр асьветы, праф. Тэнталь, ня спыніўся толькі на скарачэньні бюджэту: у сваім змаганьні з беларускаю школаю ён пашоў значна далей за сваіх п[illegible]нікаў. Калі высьветлілася, што [illegible] на адчыненьне трох новых беларускіх школ няма, дык таварыства Беларускіх Настаўнікаў у Латвіі ўхваліла адчыніць у Рызе прыватную беларускую школу ў Торэнсбергу, з тым, каб настаўнікі гэтае школы цэлы год працавалі бясплатна. Запісаліся вучні, сабраліся бацькі, прыняты быў статут прыватнае школы, па падпісцы паміж настаўнікамі рыскіх беларускіх асноўных школ была сабрана невялічкая сума грошай на наём памяшканьня, таварыства „Беларуская Хата" [illegible] трохі інвэнтару, т-ва „Беларускіх Настаўнікаў" узяло на сябе выдаткі [illegible] правядзеньні статуту, зьмялі памяшканьне, склікалі вучняў... І вось—ад міністра Тэнталя прышло паведамленьне, што ён не дазваляе адчыніць прыватную беларускую асноўную школу ў Рызе. Такім чынам і адчыненьне гэтае (ужо чацьвертае школы ў гэтым годзе!) было сарвана.

Школа нічога не каштавала-б ні ўраду, ні гораду, ніякіх матар'яльных страт ні дзяржава, ні каса г. Рыгі па ўтрыманьні гэтае школы не панесла-б, а таму ўсякія грашовыя довады адпадаюць самі сабой. Тое, што школа ўсе-такі ня была адчынена, гаворыць аб тым, што міністэрства асьветы ўзяло курс на канчатковую ліквідацыю беларускае школы ў Латвіі.

У гэтым вывадзе лёгка будзе пераканацца, калі ўспомнім, што ў бягучым годзе не адчынена ніводная беларуская школа ў вёсках, дзе беларускае жыхарства, як, напрыклад, у Ірыдуйшчыне, ужо пяць год дамагаецца адчыненьня беларускіх пачатковых школ у вёсках Савэйкі, Гарбачова і іншых. Усе захады бацькоў, якія па два-тры разы пасылаюць сваіх ходакоў у Дзьвінскую павятовую школьную раду, да гэтага часу ня маюць жаднага посьпеху.

Разам з плянавым ушчамленьнем беларускае школы з боку матар'яльнага міністэрства асьветы робіць усе высілкі да таго, каб разваліць нашу школу і з боку духоўнага. Дзеля гэтага міністэрства асьветы распачало «чыстку» сярод беларускага настаўніцтва: усё лепшае, энэргічнае, сацыяльна і нацыянальна сьвядомае—выганяецца з беларускае школы, а на месцы гэтых беларускіх настаўнікаў міністэрства асьветы прызначае беларусаў „гэтараўскага" кірунку, якія згодны выканаць ўсё, што пан міністар загадае.

З беларускіх вясковых школ ужо звольнены: настаўніца М. Касьпяровіч, настаўнік Янка Зайгліш, які адбываў існаваньне Шылаўскае беларускае школы, настаўнік Пётра Масальскі—адзін з выдатнейшых беларускіх паэтаў у Латвіі,—а на чарзе да звальненьня стаяць яшчэ некаторыя з прагрэсыўнага беларускага настаўніцтва.

Распраўіўшыся з некаторымі вясковымі настаўнікамі, міністэрства асьветы, се згоды Беларускага аддзелу, узялося за расправу з прагрэсыўным беларускім настаўніцтвам у Рызе.

Ня былі забыты і курсанты настаўніцкіх курсаў: значная частка іх пазбаўлена стыпэндый і звольнена з інтэрнату пры курсах. Незаможныя хлапцы і дзяўчаты, якія з вялікімі высілкамі скончылі гімназію і яшчэ спадзяваліся праз год-два скончыць курсы і атрымаць пасаду настаўніка на вёсцы, змушаны былі, каб пратрымацца ў Рызе на курсах і пасьля пазбаўленьня стыпэндыі, паступіць на фабрыку, дзе яны працуюць удзень, а вечары слухаюць курсы. Тая частка, што не атрымала працы на фабрыках, змушана была зусім выехаць з курсаў. У Рызе на курсах засталіся толькі такія элементы, якія палабаюцца начальству; яны атрымліваюць і стыпэндыі, або вучацца яшчэ і ў іншых спэцыяльных школах, дзе атрымліваюць дапамогу, а на беларускіх настаўніцкіх курсах толькі сьпяць у інтэрнаце, ды «лічацца» слухачамі.

Дзьвінчук.

Пуанкарэ выдае на расправу палітэмігрантаў.

ПАРЫЖ, 6-XII. Як паведамляюць з Люксэмбургу, лік высланых з Люксэмбургу італьянскіх рабочых-палітычных эмігрантаў дасягнуў 102. Усе, хто падлягае высылцы, павінны пакінуць Люксэмбург заўтра.

Паліцыя не дазволіла дэманстрацыі пратэсту рабочых каменнавугольнага басэйну проці высылкі.

БЕЛАЗЭМІГРАНЦКІЯ ПРАТЭНЗІІ НЕ ПАДТРЫМАНЫ АНГЕЛЬСКІМ СУДОМ.

ЛЁНДАН. Вярхоўны суд скончыў разгляд справы аб іску Волькі Палей; апошняя дамагалася вярнуць маемасьць, якая калісьці належала ёй, і прадказана нядаўна Дзяржгандлем групе ангельскіх і французкіх скупшчыкаў маставіх рэчаў. Суд прызнаў, што Волька Палей «была пазбаўлена належнае ёй маемасьці» на падставе савецкіх законаў, а з гэтае прычыны адмовіў ёй у іску і ўсклаў на яе выплату судовых выдаткаў.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Растуць і ўзмацняюцца калгасы

(Полаччына.)

Узрост калектыўных гаспадарак Полаччыны ілюструецца наступнымі лічбамі:

На 1 кастрычніка 1924 г.—49 калгасаў, на першае кастрычніка 1927 г.—51 калгас і на першае кастрычніка 1928 г.—90 калектыўных гаспадарак.

Гэтыя лічбы яскрава адлюстроўваюць эфэктыўнасьць мінулага апэрацыйнага году ў сэнсе ўросту калгасаў. Калі на працягу мінулых гадоў калектыўныя гаспадаркі расьлі на вучастках дзяржаўнага фонду, дык 1928 год даў прырост калектываў на працоўных сялянскіх землях, на якіх арганізавана адна камуна, 11 арцеляў і 5 таварыстваў на супольнай апрацоўцы.

Моманты бягучасьці складаў калгасаў пазбыты—гэта значыць калгасы якасна ўзмацніліся.

Вось лічбы, якія гавораць за ўрост калгасаў у эканамічным напрамку: у 1927 годзе прыходзілася аснаўнога капіталу на 1 гэктар зямлі—83 рублі, у гэтым—118 р. Сярэдняя таварная прадукцыя на адну гаспадарку выражаецца ў суме 4511 рублёў, а ў мінулым годзе складала 1524 рублі. Маемастнае становішча: на 100 гэктараў прыходзіцца копій: у 1927 г.—10,32, а ў 1928 г.—14. Трактараў у 1927 г.—0,1 а ў 1928 г.—0,15.

Так, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі колькасна растуць і эканамічна ўзмацняюцца калектыўныя гаспадаркі Полаччыны.

Анучын Пятро.

Замах на жыцьцё селькора.

Ворша, 8-XII. У вёсцы Азярцы, Круглянскага р-ну зроблены замах на жыцьцё селькора Кавалёва Цімоха. Праз вакно ноччу быў зроблены стрэл, разьбілася шкло, аднак шклянка папала ў вісок Кавалёва.

Міліцыяй выкрыта, што замах зроблены вядомым хуліганам Шапялёвым Карпам.

Прычына—выкрываючыя допісы Кавалёва аб хуліганскай дзейнасьці Шапялёва, за што хуліган і быў прыцягнуты да судовай адказнасьці. Зараз Шапялёў міліцыяй арыштаваны.

Павялічым збор мэталёвага лому.

Гомель, 8-XII. Збор мэталёвага лому ў акрузе праходзіць слаба. Кааперацыйныя арганізацыі на гэтае пытаньне не зварачаюць належнае увагі. Між тым, у селішчах акругі, савецкіх гаспадарках і нават на прадпрыёмствах маюцца рэсурсы лому.

Для ўзмацненьня збору лому акргандаль прапанаваў аддзяленьню рудамэтальгандлю разгарнуць працу па загатоўцы лому. Гомрайсаюзу і Палессельсаюзу прапанавана тэрмінова арганізаваць загатоўку мэталёвага лому, выкарыстаўшы для гэтае мэты вёзавую кааперацыйную сетку, калгасы, камуны, машынныя т-вы і спэцыяльных зборшчыкаў.

Тут, у Гомелі налажваецца збор лому ў розных майстэрнях у саматужнікаў, кватэрнай кааперацыі і праз спэцыяльны кадрзборшчыкаў. Вядуцца перамовы з саюзам камунальнікаў аб прыцягненьні да зборкі лому ў жактах і інш. домаўладальных дворнікаў, выплачваючы апошнім камісійную ўзнагароду.

Акргандаль, улічваючы наяўнасьць значнае колькасьці безгаспадарчага лому, прызнаў неабходным даць магчымасьць любому грамадзяніну паведамляць аб месцах знаходжаньня лому Рудмэтальгандлю. Апошняму прапануецца дагаварыцца з поштай аб прыёме дармовае карэспандэнцыі ў адрас аддзяленьня Рудмэтальгандлю.

Выказана пажаданьне аб арганізацыі спэцыяльных надсьлінікаў на буйных прадпрыёмствах.

КАЛГАСЫ ПАДПІСВАЮЦЦА НА ПАЗЫКУ.

Копысь, Арш. акр., 6 XII. Па райёну налічваецца 19 калгасаў, з якіх 13 прынялі ўдзел з рэалізацыі 2 пазыкі індустрыялізацыі.

Гэтыя 13 калгасаў падпісаліся на 1130 руб., што дае ў сярэднім на адзін калгас 87 р., альбо на сям'ю 7 руб.

ЖАНЧЫНУ—НА АДКАЗНУЮ ПРАЦУ.

Віцебск, 30-XI. Прэзыдыум акрвыканкому зацьвердзіў старшынёю акруговага камітэту ўзаемадапамогі жанчыну т. Лазоўскую, якая раней была старшынёю камітэту ўзаемадапамогі ў райёне.

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ ВЫКАНАНЫ.

Магілеў, 8-XII. Пяцімесячны плян хлебазагатовак (ліпень—лістапад месяцы) выкананы.

Спажывецкай кааперацыяй загатавана на 99 проц. па жыту і на 98 пр. па яравых, сальска-гаспадарчай кааперацыяй—на 100 проц. па жыту і на 80 проц. па яравых.

Загатоўкі за апошнюю дэкаду лістапада ў падлік не ўвайшлі.

ШЭФЫ НА ДАПАМОГУ.

Полацак, 8-XII. Шэфкамісіі пры прафсаюзах накіравалі па падшэфных сельсаветах сваіх прадстаўнікоў для дапамогі с.-с. у правядзеньні справаздачнай кампаніі і падрыхтоўцы да перавыбараў.

ВЫНІКІ НЯДБАЙНАСЬЦІ.

Магілеў, 8-XII. Па сутнасьці рэчаў, асеньнія месяцы павінны зьяўляцца тым часам, калі пратэрмінаваныя пазыкі ў крэдытных таварыствах паказваюць найменшую суму.

Але ня так гэта ў Магілеўшчыне, дзе пратэрмінаваныя пазыкі нават узрасьлі на 11 процантаў супроць таго, што было ўвесну, і зараз складаюць 16 проц. ад агульнае сумы пазык.

Акруговае таварыства с.г. крэдыту прымушана было закрыць крэдыты 7 крэдтаварыствам, пакуль яны не ўпарадкуюць справу з пратэрмінаванымі пазычкамі і наогул з пазычкамі.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР У ВІЦЕБСКУ РАМАНТУЕЦЦА.

Віцебск, 6-XII. Зараз ідзе праца па аднаўленьню 2-га Белдзяржтэатру пасьля пажару.

Працуюць у 3 зьмены. Праца ідзе шпаркім тэмпам. Рамонт закончыцца праз два-тры тыдні.

ВЕЛЬМІ СЛАБА З ПАЯВЫМІ ЎЗНОСАМІ.

Магілеў, 8-12. Па пляну на першы квартал спажывецкая кааперацыя павінна была сабраць 200 тыс. руб. паявых узносаў. Пакуль-што паступленьне ідзе вельмі марудна, і да 21 лістапада паступіла ўсяго 45 тыс. руб., альбо 22,6 проц. заданьня.

Калі праца будзе працягвацца гэткім-жа тэмпам, квартальнае заданьне ня будзе выканана нават на 50 процантаў.

Асабліва адстаюць райёны Крычаўскі і Карнянскі.

Больш увагі пазыцы.

(Самахвалавіцкі райён, Меншчына).

Па Самахвалаўскаму райёну сваечасова пачалася кампанія па рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі. Усяго сярод сялянства рэалізавана 14.450 р., што зьяўляецца ня зусім добра, калі ўзяць у сярэднім, дык на адзін сялянскі двор па райёну прыпадае па 1 руб. 50 кап. пазыкі.

Ёсьць сельсаветы, якія зусім нядбайна па „казённаму" падыходзілі да гэтага пытаньня, калі Байкаўскі сельсавет рэалізаваў сярод сялянства на 950 руб. пазыкі, дык Азярышчанскі сельсавет рэалізаваў на 5 руб. і вось трэба шукаць карэньні чаму Азярышчанскі сельсавет толькі рэалізаваў на 5 руб.? А таму, што там ніхто аб гэтым ня думаў і нічога не рабіў, ня гледзячы на тое, што тэрмін падпіскі працягнут да 1-га сьнежня, трэба сказаць, што ўсе сельсаветы райёну заснулі і нічога ня робяць у гэтым напрамку, але варта падумаць аб гэтым.

Э.

Бярэце прыклад.

(Вёска Дубні, Старобінскага райёну, Бабруйшчына).

Праца па рэалізацыі 2-ое пазыкі індустрыялізацыі ў нашай вёсцы адбылася з посьпехам. Сельсавет правёў два агульныя сходы сялян, дзе добра было растлумачана, для чаго дзяржава выпускае пазыкі, пасьля чаго быў зроблен абыход сялянскіх двароў.

Сельсавет меркаваў у нашай вёсцы распаўсюдзіць пазыку на 50 руб., але вышла зусім іншае. Сяляне нашае вёскі падпісаліся на 120 руб. У Чырвонаармейскім сельсавеце наша вёска па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі краіны стаіць на першым месцы. Сяляне ваколічных вёсак, бярэце прыклад з нашай вёскі.

Шарко Юрка.

Зьбіваюць цану.

(М-ка Круча, Круглянскага райёну, Аршаншчына).

У м-ку Круча маецца спажывецкае таварыства і сельска-гаспадарчая крэдытная кааперацыя. Абодвы яны маюць хлебазагатоўчыя пункты. Але ўсяго яны нарыхтавалі па 200 пудоў насеньня.

Былі выпадкі, калі загатоўцы перабягалі з аднаго месца на другое і кожны стараўся з іх быць наперадзе. Часта загатоўца крэдытнага таварыства прыходзіў да месца куплі загатоўцам спажыўнога таварыства і набаўляў цану, ды такую, што і плаціць нельга было.

Сяляне, пачуўшы, што ён дае большую цану, везьлі да яго. Але, калі да яго прывозілі, дык ён пачынаў адмаўляцца плаціць раней умоўленую цану, бо такой зусім ня існавала. Сяляне варочаліся дамоў вельмі нездаволеныя і сказдзіліся, што кааперацыя ня мае цьвёрдых цэн і яны прадавалі свой тавар прыватнікам на станцыі Слаўнае. Гэткіх фактаў было шмат. Таму ў нас загатоўка ідзе вельмі слаба.

Чаму не арыштаваны бандыты?

Ворша, 8-XII. Нядаўна вясковы актывісты вёскі Савішчаны, Крапівенскага с.-с., Аршанскага райёну, Міцкевіч М., праводзіў сход сялян па пытаньні аб калектывізацыі.

Калі вечарам Міцкевіч М. зварочваўся дамоў, на яго напалі ўзброеныя хуліганы Гарбачэўскі М. і Белаўскі і нанесьлі пабоі.

Якраз у гэты час выпадкова трапіў на гэта зда ньне гр-н Рашкевіч. Калі хуліганы заўважылі яго, дык адстрэльваючыся скаваліся ў начную цемень.

Пакуль яшчэ нічога невядома аб арыштаваньні хуліганаў.

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы.

Мала с-г. машын і прыладаў.

Праца па падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі па лініі Белсельсаюзу знаходзіцца ў поўным разгары. К сучаснаму моманту ўжо заключаны генэральныя дагаворы на с-гасп. машыны, мэталічныя тавары, штучнае ўгнаеньне і на насеньне.

Пры разьмеркаваньні ў Саюзным Наркамгандлі с-г. машын патрэбы БССР далёка не задаволены.

Па гэтаму пытаньню паднята ўжо хадайнічаньне перад вышэйшымі органамі Саюзу аб перагляндзе разьмеркаваньня.

Як ідзе загатоўка насеньня.

Для патрэб БССР неабходна 672 тоны канюшыны. Між тым у межах БССР можна будзе загатовіць 293 тоны і завезьці з РСФСР 164 тоны. Такім чынам недахоп будзе каля 300 тон, які ўнутранымі рэсурсамі краіны ня можа быць пакрыты. Ня лепш становішча з лубінам: значная частка яго не дасьпела, а той, што дасьпеў, мае вялікі процант вільготнасьці. З агульнай лічбы ў 1800 тон. лубіну, які патрэбен да пасеўнай кампаніі, чакаецца дэфіцыт у 1000 тон.

Нездавальняючае таксама становішча і з насеньнем лёну-даўгунца.

Агульны плян у 2533 тон можна будзе пакрыць загатоўкамі ў БССР толькі 321 тону, а рэшту павінен даць завоз з лёнаводных райёнаў іншых рэспублік. Але завоз насеньня лёну-даўгунца можна разьлічваць у лепшым выпадку на 1000 тон.

Штучнае ўгнаеньне.

У галіне штучнага ўгнаеньня будзе адчуваецца недахоп касьцяной мукі, калійная соль увозілася з-заграніцы і не маркуем атрымаць толькі 31 проц. нашага пляну. Пра тамасшалак яшчэ нічога ня чуваць.

Лепш за ўсё стаіць справа з суперфасфатам. Трэба сказаць, што на загатоўцы суперфасфату мы ўжо зараз выканалі гадавы плян на 70 пр.

Ячмень і авёс.

Да вясеньняй пасеўнай кампаніі нам трэба загатовіць 2.300 тон ячменю. Ёсьць надзея, што патрэба ў ім будзе пакрыта шляхам мясцовых загатовак.

Што трэба зрабіць.

Каб сустрэць вясеньнюю пасеўную кампанію падрыхтаванымі, трэба прыняць самыя рашучыя меры да разгортваньня загатовак на ўнутраным рынку пасеўнага матар'ялу наогул і асабліва канюшыны, лубіну, пазепшанага насеньня лёну, аўса і ячменю.

Адносна сельска-гаспадарчых машын і штучнага ўгнаеньня трэба тэрміновa паставіць пытаньне перад урадавымі органамі СССР аб пераразьмеркаваньні рэсурсаў саюзу паміж рэспублікамі.

Трэба таксам нашай беларускай прамысловасьці падцягнуцца і сваечасова выканаць свае вытворчыя пляны па сельска-гаспадарчых машынах і прыладах. Побач з гэтым нашы заводы павінны наладзіць выпуск тых сельска-гаспадарчых машын, якія не вырабляюцца ў дастатковай колькасьці заводамі іншых рэспублік.

Агонь па клясаваму ворагу.

Беднота патрабуе пакараньня кулакоў-тэрарыстаў.

Адным з характэрнейшых наступленьняў на беднату—зьяўляецца тэрарыстычны акт кулацтва ў Траскоўскім сельсавеце Заслаўскага райёну, дзе праз забойства бедняка—прадстаўніка інтарэсаў беднаты Дударчыка Міхася, кулацтва—іменна кулацтва, а не які небудзь індывідуал-кулак, хацелі запалохаць усю беднату Траскоўскага сельсавету.

Тав. Дударчык быў ініцыятарам аб'яднаньня ўсіх лясоў мясцовага значэньня ў адно лясное таварыства на тэрыторыі ўсяго Траскоўскага сельсавету, каб, такім чынам, даць магчымасьць беднаце атрымоўваць лепшы лес, а гэтым самым пазбавіць кулакоў атрыманьня дарэмнага лесу, бо кулакі мелі на сваіх былых землях добры лес і аб'яднаўшыся фармальна ў таварыствы секлі лес па сваіх поглядах і патрэбах, а беднота гэтага лесу не магла атрымаць.

Тав. Дударчыку, які быў лясьніком лясоў мясцовага значэньня, кідалася ў вочы нанаваньне кулакоў над лясамі, якія перададзены дзяржавай у карыстаньне сялян для таго, каб здаволіць патрэбу беднаты ў лесе ў той часьці, у якой поўнасьцю дзяржава ня можа забясьпечыць яе бясплатным лесам.

Пасьля таго, як беднота Траскоўскага сельсавету, разам з серадняком, канчаткова вырашылі пытаньне аб аб'яднаньні лясоў, і для выкананьня гэтага рашэньня зьявіліся ў Траскоўскі сельсавет, у РВК і лясьніцтва, дык кулакі в. Барсукі Лях Кастусь, Лях Васіль, Патаповіч Юстын і Бобрык Мікалай асьмеліліся выступіць з тапарамі і лапатамі... Але пасьля таго, як усётакі, лес быў аб'яднаны, ня гледзячы на бандыцкія выступленьні кулакоў, вышэйпамянёныя кулакі пагразілі тав. Дударчыку: мы табе пакажам як аб'яднаць наш лес.

З 10 на 11 лістапада, увечары, тав. Дударчык, як старшыня камітэту ўзаемадапамогі, з другім членам камітэту складаў сьпіс беднаты на атрыманьне хлеба з кааперацыі, кулакі падпёрлі дзьверы яго хаты і выстралам з поляўнічай стрэльбы праз вакно звалілі яго, выбілі яму вочы і скалечылі ўвесь твар.

Яшчэ невядома ці будзе жыць тав. Дударчык (ён знаходзіцца ў 1-й савецкай больніцы ў гор. Менску), але калі ён і застанецца жыў, то ўсёроўна кулакі зрабілі яго вечным пакутным інвалідам.

Вось да якога жудаснага кашмару даходзіць кулацтва, каб тэрарыстычнымі актамі запалохаць беднату і палітычную і эканамічную актыўнасьць.

Макчыйся па гэтай справе сьледчы матар'ял поўнасьцю гаворыць,—што гэты тэрарыстычны акт—рук кулакоў Ляха Кастуся, Ляха Васіля, Патаповіча Юстына і Бобрыка Мікалая.

Справаздачны пленум Барадынскага сельсавету (суседняга з Траскоўскім сельсаветам), адбыўшыйся 25 лістапада г. г. з удзелам актыву і беднаты, вынес пастанову, патрабуючую суровага пакараньня злачынцаў і заклікае батракоў, беднату з серадняком, цесна згрупавацца і пад кіраўніцтвам партыі і савецкай улады і даць належны адпор кулацтву ў прадстаячую перавыбарчую кампанію саветаў, каб ні адзін кулак не прапез у саветы.

П. Ягаўдзік.

Атрымалі „благаслаўленьне" на антысэміцкую чыннасьць.

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта).

Нейкую недасяжную выспу ўяўляе сабой шкляны завод «Ноўка», які знаходзіцца ў Сураскім райёне. „Ноўка" ня мае свайго тэлефону, а пошта туды прыходзіць два разы ў тыдзень. Пляхі, якія вядуць на завод, на поўдня часы заліваюцца вадою як увосень, так і ў вясну.

Аснова ўсіх асноў на заводзе—гэта майстар. Яшчэ з даўных часоў ён лічыцца начальствам, ён мае права заадваць, абляць, зьдзекавацца над рабочым, над сваім падсобным,—бо ён—майстар.

Быў гэткі выпадак. Дзевятнаццацігадовая камсамолка Васількова працавала адносчыцай у майстра Краснадэмскага. Ужо даўно яна церпіць кпіны, але ўсё маўчала.

Аднойчы майстар назваў яе прастытуткай Васількова да крыві закусіла губы і, нічога не гаворачы нікому, захапіла з сабою соды, якую засыпаюць у ванную печ, і атруцілася. Праўда, сваечасова прынятымі мерамі Васількову выратавалі ад сьмерці. Справа была перададзена ў суд, але на судзе Васількова з Краснадэмскім памірыліся. Васількова баялася пайсьці супроць майстра, а яе ніхто не падтрымаў.

Ня лепш і іншыя майстры. Хашкоўскі і Дзік,—паміж іншым, абодвы камсамольцы,—аблёваюць вадой, а часам і зьбіваюць камсамолку Ушкалаву. Майстар Кісялеў б'е трубкай балачніка. Не адстае ад яго і майстар Сьпірыдонаў са сваімі падзытыльнікамі.

— Гэтак было, гэтак і будзе—гаворыць на заводзе і ніхто ня можа адважыцца парушыць гэтае балота, пакончыць з гэткім бяспраўем рабочых.

Законам амаль што для ўсіх шкляных заводаў зьяўляецца тое, што яўрэй майстрам быць ня можа. На „Ноўцы„—550 рабочых, з іх толькі 5 яўрэяў, і ўсе яны выконваюць падсобную работу.

Натхніцелем і арганізатарам антысэмітаў на „Ноўцы" быў Лібскі Зьміцер, які зараз, паміж іншым, працуе на бабруйскім заводзе «Октябрь». Зараз Лібскага на заводзе няма, але за тое засталіся яго пасьлядоўцы. Антысэмітыям знаходзіць месца ў рабочай масе і нават сярод камсамольцаў. Загадчыкам клюбу на „Ноўцы" зьяўляецца т. Дворкін. Аднойчы, пасьля поўначы, калі Дворкін заявіў аб тым, што ўжо час зачыніць клюб, з натоўпу выскачылі партыйцы Каліноўскі і Філіпаў і паднялі на яго крык.

— Гаспадар тут знайшоўся. Нейкі жыд будзе размаўляць. Дуй яго, хлопцы.

Каб Дворкін адразу не пакінуў клюб, дык яму-бы здорава дасталося.

Раз у час работы жывой газэты Дворкін зьвярнуў увагу камсамольца Патоцкага на яго хуліганскія паводзіны, якія перашкаджаюць нармальнаму ходу заняткаў. Патоцкі кінуўся на яго са словамі:

— Жыдоўскае засільле, камандуюць тутака.

І характэрна, што калі гэтае пытаньне разьбіралася на пасяджэньні бюро камсамольскага калектыву ў прысутнасьці сэкратара райкому т. Дамарацкага, дык была вынесена пастанова „абвесьціць Дворкіну вымову за няпрыняцьце мер па ўзмацненьню культработы і за грубасьць".

Замест таго, каб прывазаць к парадку зарваўшыхся камсамольцаў, сэкратар райкому Дамарацкі знайшоў патрэбным усю адказнасьць усклаьці на Дворкіна, які належным чынам ня выхаваў камсамольцаў заводу, каб яны сабе лепш трымалі. Такім чынам, антысэміты ня толькі засталіся непакаранымі, але, наадварот, атрымалі дапамогу і „благаслаўленьне" ад свайго райкому на далейшую антысэміцкую чыннасьць.

Трэба ўзварушыць гэтае балота. Трэба зьвярнуць увагу ўсяе рабочае і савецкае грамадзкасьці на становішча нашых шкляных заводаў. Апошнія падзеі на заводзе «Октябрь», „Домбале", «Ноўцы»—сыгналізуюць нам аб тэй значнай небясьпецы і аб тых непарадках, якія ўкараніліся на нашых шкляных заводах.

Макс.

ПОЛЬШЧА--РУМЫНІЯ--ВЭНГРЫЯ.

Візыты французкага генэрала Лерона ў сталіцы Сэрбіі, Румыніі, Вэнгрыі, Польшчы і іншых дзяржаў выклікалі гутаркі аб іх мэтах. Ня толькі савецкая, а і вельмі значная частка эўрапейскай буржуазнай прэсы бачаць у гэтых візытах падрыхтоўку антысавецкага блёку на выпадак вайны. Утварэньню гэтага блёку перашкаджаюць існуючыя між некаторымі дзяржавамі розныя непаразуменьні. Адной такой перашкодай зьяўляецца варожыя ўзаемадносіны між Румыніяй і Вэнгрыяй. Як вядома, Румынія пасьля сусьветнай вайны далучыла да сябе па трактату ў Трыянон так званае Сямігрэдзьдзе—былую вэнгерскую правінцыю. Вэнгрыя да апошняга дня ніяк ня можа з гэтым памірыцца, тым больш, што Румынія дзеля вымаганьня вэнгерскіх уплываў у новадалучанай правінцыі правяла ў ёй радыкальную зямельную рэформу, пакінуўшы вэнгерскіх магнатаў без зямлі. Магнаты заапэлявалі ў Раду Лігі Нацый, якая стала на баку Румыніі, бязмоўна, дзякуючы падтрыманьню Францыі і пасыўнасьці Англіі. Аднак, ангельскія лёрды, якія ўбачылі ў такім вырашэньні справы «пакрыўджанае» інтарэсаў вэнгерскіх магнатаў, уступіліся за сваіх клясавых саюзьнікаў. Узьнік спэцыяльны «лёрдаўскі» камітэт, які і распачаў вядомую акцыю лёрда Ротэмэра. Пад націскам гэтага камітэту Чэмберлен зьмяніў свае погляды на вэнгерскую справу, пасьля чаго і Францыя не магла далей фарсаваць антывэнгерскага курсу ў справе «пакрыўджаных» вэнгерскіх абшарнікаў. У далатак і Мусаліні спаралізаваў французкую дыпляматыю, выступіўшы ў ролі абаронцы «прыгнечанай Вэнгрыі».

Нават польскія абшарнікі, у прыватнасьці-ж чэрныя манархічныя колы польскай арыстакратыі, пачулі «уродзіную» сымпатыю да вэнгерскай магнатэрыі. Віленскае «Слово» і іншыя манархічныя польскія газэты заняліся нават шуканьнем «дынастычных канцэпцый», але гэтыя фантастычныя пляны не знайшлі, відаць, водгуку ў адпаведных палітычных сфэрах Польшчы. Тым ня менш Польшча, бязмоўна, зацікаўлена ў зьліквідаваньні румынска-вэнгерскіх непаразуменьняў і вось чаму. Польшча знаходзіцца ў саюзе з Румыніяй. Саюз гэты мае выключна вайсковы характар на выпадак вайны з СССР. Зразумела, што для Румыніі і яе саюзьніцы Польшчы нявыгадна мець у сваім тылу варожую Вэнгрыю, якая—хто яе ведае — можа ў крытычны момант ударыць у тыл Румыніі і значна перашкодзіць румынскім і польскім плянам. Дзякуючы такому стану рэчаў, Вэнгрыя ў апошнія часы зрабілася аб'ектам асаблівай увагі з боку як французкага паліт-камізажэра генэрала Лерона, так і польскіх і румынскіх палітыкаў. Новы румынскі ўрад Маніу зусім зьмяніў варожую да Вэнгрыі палітыку свайго папярэдніка Братыяну на палітыку замірэньня і згоды.

Усё гэта робіцца пад уплывам Англіі і Францыі, якія маюць тут сваю мэту утварэньня адзінага антысавецкага фронту. Маніу даў згоду праводзіць палітыку сваіх суверэнаў уамен за патрабную для Румыніі назыку. Польшча, як саюзьніца Румыніі, ня можа не дапамагаць апошняй, а таксама Францыі і Англіі прыцягнуць на свой бок Вэнгрыю. Ня можа быць і гутаркі, што Польшча прымае актыўнейшы ўдзел у перагаворах аб уцягненьні Вэнгрыі ў антысавецкі блёк. Прыезд у Варшаву вэнгерскага міністра замежных спраў Валько бязмоўна мае з гэтай справай цесную сувязь. Хто гэта можа паверыць, што Валько прыехаў у Варшаву толькі для таго, каб падпісаць малазначны арбітражны трактат і дагаварыцца аб некаторых зьменах у гандлёвым трактаце. Дзеля такіх глупстваў міністры самі віколі яшчэ ня езьдзілі ў госьці, бо іх з посьпехам у такім выпадку могуць замяніць паслы. Справа ясная, што трэба было абгаварыць з вока на вока больш важныя справы.

Дзеля тае-ж мэты—перагавораў аб антысавецкім блёку—у другой палове сьнежня г. г. прыяжджае ў Варшаву новы міністр замежных спраў Румыніі Міранеску. І тут польскія газэты маняць, быццам Міранеску прыяжджае толькі для ўстанаўленьня больш цеснай сувязі і прыязьні між польскім і новым румынскім урадам. Хіба для навязаньня больш цеснай дружбы міністры абавязкова павінны рабіць візыты? Візыты дыплёматаў робяцца для інтымных палітычных размоў, якія не выпадае весьці пры дапамозе дыплёматычнай перапіскі. Бязмоўна, і Польшчы і Румыніі патрэбна дагаварыцца аб агульным кірунку іх палітычнай лініі ў сувязі з новым курсам антысавецкай палітыкі.

Што гэта так, відаць хоць-бы з інтэрв'ю таго-ж міністра Міранеску, у якім ён заявіў прадстаўнікам друку, што Румынія хоча захаваць свае адносіны з саюзнымі дзяржавамі і ўзнавіць нармальныя адносіны з дзяржавамі, з якімі Румынія знаходзілася ў варожых адносінах. Што-ж датычыць паведамленьняў замежнага друку аб магчымым аднаўленьні зносін між Румыніяй і СССР, дык гэтыя паведамленьні, па словах Міранеску, няправільныя, бо гэтае пытаньне ў сучасны момант не зьяўляецца актуальным.

Як бачым, Міранеску зусім сьцьвярджае нашыя думкі. Румынія імкнецца цяпер яшчэ больш замацаваць сваю дружбу з саюзьнікамі, г. ё. з Польшчай і Францыяй. Мала гэтага, адносіны Румыніі з Вэнгрыяй і нават Баўгарыяй былі да апошняга часу варожымі. Цяпер Румынія імкнецца ўстанавіць з імі нармальныя зносіны. І ўсё гэта разам узятае, мае сваю канчатковую мэтаю аб'яднаньне сіл проці СССР, аднаўленьне зносін з якім Міранеску прызнае ў сучасны момант не актуальным.

Зусім правільна! Ці-ж можна думаць аб аднаўленьні нармальных зносін у той час, калі ў прысьпешаным парадку ідзе падрыхтоўка ў зусім іншым кірунку.

Падрыхтоўваючы грунт для нападу на СССР шляхам устанаўленьня новых асноў ва ўзаемаадносінах з суседзямі, Румынія не адмаўляецца выкарыстоўваць і варожыя нам эміграцкія колы.

Румынія зьбірае ўсе варожыя СССР сілы, каб вык

Напярэдадні перавыбараў саветаў.

НА СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАХ КУЛАКІ РОБЯЦЬ СПРОБУ АТАКАВАЦЬ ОРГАНЫ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ НА ВЁСЦЫ. АБ'ЯДНАНЫМ ФРОНТАМ БАТРАЦТВА І БЕДНАТЫ РАЗАМ З СЕРАДНЯКАМІ ДАМО РАШУЧЫ АДПОР КУЛАЦКАМУ НАСТУПУ.

Беднота адбіла кулацкі наступ.

(Клічаўскі райён).

18-га лістапада адбылася агульная сходка гр-н вёскі Вольсы, Запольскага сельсавету. На гэтай сходзе былі настаўлены справаздачы сельскага савету, кааперацыі, школы і хаты чытальні. На агульнай сходзе прысутнічала каля 200 чалавек, а таксама прадстаўнікі ад РВК і Бацвіцкай ячэйкі КП(б)Б.

Пасля ўсіх справаздач з боку пасельніцтва была ўзьнята дзелавая крытыка працы гэтых устаноў і падчас вельмі шмат недахопаў у працы.

Галоўныя з іх:

Кааперацыйная крама часта зачыняецца сам прадаўнік у гэты час працуе на сваёй гаспадарцы.

Праца па хлебазагатоўцы па с.-с. амаль што зусім адсутнічае.

Маюцца настаўнікі, якія ніякай пазашкольнай працы не вядуць. Зусім адсутнічае праца сярод жанчын, не гледзячы на тое, што маецца жанчына—настаўніца. Настаўніцтва не дапамагае ў працы хаты-чытальні, а таксама ня мае добрага аўтарытэту сярод беднаты.

У сельсавеце маецца каля 200 дзесяцін запаснага фонду, якім у большасці сваёй карыстаюцца гр-не вёскі Вольса, а за яе падатку зусім ня плацяць. Часта за гэтай зямлёй у Райземадзел зварочваліся малазямельныя, але-ж там сялянаў загадчык земсьпраў т. Мількавіч, жыхар гэтай вёскі, які гэты запфонд не разьмяркоўваў, бо ім карысталіся яго радня і знаёмыя.

Дрэнна паступае сельска-гаспадарчы падатак. Маецца 1 гандляр, які таргуе без патэнту.

На агульным сходзе былі выступленьні з боку заможных, апошнія выказваліся, каб ня браць памольны збор з млыноў, не патрэбна праводзіць бядняцкіх сходак і інш., але на гэта з боку беднаты быў дадзены належны адпор.

У далейшым патрэбна будзе больш практыкаваць гэткія сходкі. Беднаце і сераднякам патрэбна ў часы перавыбараў с.с. яшчэ больш згуртавацца, каб не дапусьціць у сельсавет заможнікаў і кулакоў.

Ведаючы.

Праца сельсавету пад агнём самакрытыкі.

(Уваравіцкі райён, Гомельшчына).

У вёсцы Лапічы на справаздачным сходзе крытыка працы сельсавету была здаровая і дзелавая. Выступаючыя ў спрэчках паказвалі на тое, што сельсавет зьвяртаў мала ўвагі пажарнай справе; не клапаціліся аб пабудове ў вёсцы Радзеева пажарнага складу для захаваньня машын, аб арганізацыі пажарных дружын у буйных насельніцкіх пунктах. Мала сельсавет зрабіў у справе ўпарадкаваньня вёскі, у некаторых месцах студні на палову разбураныя, не агароджаны, каля студняў балота і г. д.

Культурна асьветная праца кульгае ў вёсцы Радзеева, слаба працуе хата-чытальня, сельсавет не паклапаціўся ў падшуканьні памяшканьня для чырвонага кутка ў вёсцы Лапічы. Мала зрабіў сельсавет у асеньня-пасеўную кампанію, не паклапаціўся аб своечасовай дастаўцы абозу ў вёску для адсартоўкі збожжа.

Амаль нічым сельсавет ня можа пахваліцца ў сэнсе ўзьняцьця сельскай гаспадаркі, некаторыя пасёлкі перайшлі на шматпольле вясной, а цяпер зноў пачалі ўжываць трохпалёўку, сельсаветам ня было сумесна з аграномам праведзена растлумачэньне па гэтаму пытаньню. Слаба вялася праца сельсаветам з натравамі.

Слабае кіраўніцтва з боку сельсавету існуючымі на тэрыторыі сельсавету ўсякімі арганізацыямі і ўстановамі, а таксама практычная дапамога ў іх працы. Зазначалі на тое, што некаторыя члены сельсавету нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў, і таму нярэдка бываюць выпадкі зрыву пленумаў сельсавету, а таксама і прэзыдыуму сельсавету з прычыны неяўкі членаў сельсавету.

Сэкцыі пры сельсавеце, якіх налічваецца тры, лічыліся толькі на паперы, гэта таму, што сябры сельсавету, якія вылучаны працаваць у сэкцыі, нічога не рабілі. Члены сельсавету на пасёлку нічога ня робяць і іх прысутнічаньне ня адчуваецца, прэзыдыум сельсавету не кіраваў імі і мала ім дапамагаў у практычнай працы.

Зазначалі на тое, каб часцей прыяжджаў на пасёлкі аграном, а таксама зазначалі на тое, каб сельсавет паклапаціўся аб адчыненьні школ на далёкіх пасёлках, як Высокая Грыва і Цёмны Осаў.

Часу да перавыбараў засталося мала. А таму трэба неадкладна ўзяцца за правядзеньне працы з беднатой, і дабіцца таго, каб на выбарчыя сходы зьявіліся ўсе выбаршчыкі, і каб у склад сельсаветаў увайшло больш беднякоў і батракоў.

М. Н. Драбышэўскі.

Перавыбары спаткаем падрыхтаванымі.

(ЧЭРВЕНСКІ РАЙЁН, МЕНСКАЙ АКРУГІ).

Работа па падрыхтоўцы да перавыбараў сельсаветаў у Чэрвенскім райёне праведзена загадзя.

У параўнаньні з мінулай перавыбарчай кампаніяй, лік выбарчых вучасткаў у гэтым годзе павялічыўся на 17 на вёсках, па гораду 2. У мінулым годзе было 77, а ў гэтым—94.

Адначасова з разьбіўкай на выбарчыя вучасткі быў складзен каляндарны план справаздачнай і перавыбарчай кампаніі і было прыступлена да складаньня сьпісаў выбаршчыкаў і выяўленьне асоб пазбаўленых праў. Па сельсаветах дадзены ўказаньні аб парадку складаньня справаздач перад выбаршчыкамі і запрапанавана прыняць меры да павялічэньня ўдзельнічаньня працоўнага сялянства ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Справаздачная кампанія пачынаецца з 1-га сьнежня і канчаецца 25, у час якой упаўнаважаныя на зьмене будуць знаходзіцца ў сельсаветах і перад кожным выездам апошнія выяўляюць у РВК для атрыманьня належных практычных указаньняў у далейшай іх працы.

Сходы беднаты праводзяцца на кожным выбарчым вучастку за 3 дні да справаздачы, а таксама праводзяцца і перад выбарамі. У час кампаніі 2 справаздачы будуць зроблены на польскай мове, і адна—на яўрэйскай мове.

У кожным сельсавеце праводзіцца адзін сход жанчын з ваколічных вёсак з пытаньнем справаздач сельсавету, а таксама перавыбары прапрацоўваюцца на делегацкіх сходах.

Па ўсіх партыйна-савецкіх, прафесыянальных арганізацыях прапрацована пытаньне аб характары складаньня наказу новаму складу с.-с., аб выяўленьні актыва ў новы склад с.-с., аб выбарах жанчын у с.-с. і інш.

25 лістапада была праведзена райённая нарада груп беднаты, на якой прапрацавана пытаньне перавыбараў і ўдзел у гэтай кампаніі бедноты, таксама праведзен агляд груп беднаты прадстаўнікамі РК КП(б)Б і дадзены ўказаньні ў далейшай іх працы.

Праведзена нарада селькораў, на якой галоўным чынам завострывалася ўвага перавыбараў сельсаветаў і ўдзел у гэтай кампаніі з боку селькораў.

Пры такой пастаноўцы падрыхтоўчай работы можна спадзявацца, што кампанія перавыбараў сельсаветаў у гэтым годзе пройдзе надзвычайна добра.

М. Процька.

Справаздачная кампанія зрываецца.

(Сястронскі с.-с., Полацкага райёну).

Справаздачы сельсаветаў праведзены на 4-х выбарчых вучастках (усяго па с.-савету—6 вучасткаў), з боку с.-с. і парт'ячэйкі не праведзена належная падрыхтоўчая работа да перавыбараў, стала не разьмяркованы выбарчыя вучасткі, маюцца вучасткі, якія ахапліваюць 24 населеных пункты з лікам 583 выбаршчыкаў, не наладжаны апавяшчэньні насельніцтва аб справаздачы с.-с., упаўнаважаныя с.-с. і вёсак носяць апавяшчэньні ў кішэні і не апавяшчалі сялянам, дзякуючы чаму цэлыя вёскі ня былі ахоплены справаздачнай кампаніяй (в. в. Грашанята, Маставуха, Старана).

Вынікам чаго маецца наступнае: па Чаміскаму справаздачнаму пункту яўка выбаршчыкаў была ў 20,6 пр., мужчын 36,6 проц. і жанчын 6,9 пр. Па Лютаўскаму справаздачнаму пункту агульны процант яўкі 29, а па іншых трох пунктах рэгістрацыя не вялася і ўстанавіць зараз колькі прысутнічала няма магчымасьці. Сьпісы выбаршчыкаў с.-с. ня складзены, адсутнічаюць нават і лічбовыя веды выбаршчыкаў па кожнаму пункту. Сьпісы пазбаўленых правоў у с.-с. ня складзены і на справаздачных пунктах ня вывешаны.

Ня была праведзена работа з членамі с.-с., якія нават на сваіх вучастках ня прысутнічалі, а прысутнічаючыя актыўнага ўдзелу ня прымалі; тое самае можна заўважыць, што партыйцы і камсамольцы сяляне ня ўдзельнічаюць на справаздачных пунктах (пункт Ларкаўцы і Дойлідава).

Такім чынам, уся работа праведзена амаль што ў 2-3 дні старшынёй і сакратаром с.-с., якія гэтую палітычную кампанію праводзілі разам са штодзённай сваёй работай, як, напрыклад, па Чаміскаму пункту ачыніўся сход толькі ўвечары з прычыны таго, што старшыня с.-с. хадзіў па вёсках і складаў акт на паўшую жывёлу. Ня згрупавана ўвага ўсёй грамадзкасьці і насельніцтва вакол гэтае кампаніі, грамадзкія арганізацыі як КСУ і кааперацыя і інш. абсалютна ніякага ўдзелу ў справаздачнай кампаніі ня прымаюць. Групы беднаты арганізавана ня ўдзельнічалі па справаздачных пунктах.

Падводзячы папярэднія вынікі праробленай падрыхтоўчай работы, трэба адзначыць непрацаздольнасьць і «казённы» падыход да сваёй працы выбарчай камісіі сельсавету, у складзе якой адсутнічаюць нацмены (яўрэі). Да сур'ёзных недахопаў падрыхтоўкі справаздачнай кампаніі ў Сястронскім с.-с. трэба аднесьці слабую пастаноўку агітацыйна растлумачальнай работы, ня была праведзена масавая работа з абіраемымі і ў прыватнасьці з беднатой. Нічога ня робіцца па ўзмацненьню блёку беднаты з серадняком, саюзу рабочае клясы з сялянствам. На гэту працу не зьвярнулі належнай увагі парт'ячэйка, савецкія і грамадзкія арганізацыі, а між тым беднота і серадняцтва цікавяцца справаздачнай кампаніяй і ўсёй праваздзімай работай. У дакладах змазваюцца нашы дасягненьні і цяжкасьці сацыялістычнага будаўніцтва.

Да сканчэньня справаздачы яшчэ маецца нейкі час, неабходна выправіць памылкі і праверыць іх у іншых мясцох, а Полацкаму РВК, выбарчай камісіі, а таксама і акруговай выбарчай камісіі неабходна зьвярнуць больш увагі на жывое практычнае кіраўніцтва справаздачнай кампаніяй на мясцох.

Мурашкевіч.

НА СХОДЦЫ Ў ЛЯДЧАН

(З блёк-ноту па справаздачным сходзе).

Невялічкая хатка бітком набіта—цяжка ўлезьці ў хату, няма дзе дзявацца.

Сабралася чалавек 90, ці 36 проц., абіральнікаў, і адносна да дваро́ў 145 пр. з іх беднякоў 65 пр. серадняко́ў 22 пр. і заможных 13 пр. жанчын 20-22 пр.

Відаць заможнікі асабліва актыўныя. Прышлі ўсе, хочуць падтрымаць свайго сябра сельсавету.

Кончылася рэгістрацыя сабраўшыхся. Адчыняецца сход. Заможнікі ў прэзыдыум кінуць свайго заможніка, які плаціць 168 р. падатку.

З хумылкай спаткалі беднякі справаздачу сябра сельсавету кулака Кашэўскага.

Пры мінулых перавыбарах, шэпча мне бядняк, кулак Кашэўскі прайшоў у сябры с-с. таму, што беднота была не арганізавана, а заможнікі арганізаваліся. Ён не абараняў інтарэсы нашы.

Адчыніліся пытаньні і спрэчкі.

Твар Кашэўскага выкрываецца. Выяўляецца і сьвядомасьць беднаты.

— Як Кашэўскі заступаўся за беднату?—першае пытаньне, прыніраючае кулака да сьцяны.

— Я за бедняка заўсёды, чуць чуўся алкаш, што трэба было заўсёды і выпаўняў.

Падняўся шум, не даюць хітрыць і апраўдвацца кулаку.

—Я скажу, як Кашэўскі абараняў бедняка, кажа адзін дзядзька серадняк, як прышлося ісьці рабіць мост па самаабкладаньню, дык ён хутаранцам давяў: ня ідзіце рабіць, а гнаў бедняка.

— Мяне за адзін дзень працы заставіў працаваць 4 дні, дадае другі.

— Знаем як абараняў—замячаюць і яшчэ некалькі, заўсёды за багатага, а не за бедняка.

— Гэта па злосьці, чуюцца ў апраўданьне словы. Апраўдвацца няма чым. На дапаможу выступае жонка. Зноў мала карысьці. Настатак пазтрыманьне ад сяброў. Пасыпаліся жазьбы.

— Чаму гэта ў сав. уладзе, а ня роўна, кажа адзін хутаршчык. Трэба, каб усім было роўна, а то ў нас у х. Забярозаўцы карова даражэй лічыцца ў падатак, і зямля даражэй, чым у в. Лядах.

— З нас узыскалі самаабкладаньне, кажа другі, плацячы 135 р. падатку, а з бедняко́ў не.

Нашы каровы таньней улічваць трэба, дадае жонка сябра сельсавету (абкладзены па с.-г. падатку) у індыв д. падатку), бо нам пастух даражэй каштуе.

Зноў няма чаго казаць, жалабы кулакоў і заможных раскідаліся, атрымаўшы рашучы адпор.

Побач з вылазкай заможных, хацеўшых узяць у свае рукі сходку, прахадзіць цэлы шэраг важных, дзелавых пытаньняў па дакладах:

Ці чысьцілі насеньне?

Чаму ня бачым агранома?

Як атапліваецца школа?

Як часта склікаліся сходкі бацькоў?

Як з дапамогай вучням беднаты? і г. д. Усяго каля 20.

Праву сельсавету крытыкавалі мала, але добра.

— Калі к-т выдаваў насеньне, дык мне далі аднаго сьмяцьця,—кажа адзін бядняк.

—Мы падавалі заяву каб у нас зьнялі настаўніка, а з райёну нам нічога не адказалі.

— Сходкі бацькоў трэба праводзіць часьцей, тады лепш можна будзе і палепшыць працу школы.

— Правесьці як найхутчэй землеўпарадкаваньне.

Гэтыя выказваньні беднаты кажуць за тое, пра праца КСУ зусім дрэнная, што мясцовая школа працуе ня добра, што сельсавет мала зварачваў увагу на гэта, а самае галоўнае, што неабходна землеўпарадкаваньне, беднота ўсе сілы кладзе, каб яго правесьці, а багатыя тармозяць.

Асабліва цікавяць выбары.—Дайце цяпер вылучым на абгаварэньне каго будзем абіраць—прапануюць некаторыя.

Высьвятляецца, што заможнікі, зноў мецяць кулака Кашэўскага, а калі ён ня пройдзе, дык прыкрываючыся аваньнем дэмабілізаванага чырвонаармейца, абраць Мышынскага, які мае 20 дзес. зямлі і ідзе супрэць інтарэсаў беднаты.

Не застаўляюць з боку заможнікі і жанчын. Яны таксама намячаюць абраць Марыю Кашэўскую хутаранку-заможніцу. Зусім другі сьпіс у беднаты. У ім: батрачка, жонка сябра саюзу, два беднякі.

Сёлета мы маем сваіх кандыдатаў, кажуць беднякі і заможніку ўжо не пралезьці. Бязумоўна, так і будзе.

Позна, а 1 гадзіне ўначы (сходка пачалася, а 8 гадзіне ўвечары) прыняліся лядчане прынімаць рэзалюцыю па дакладах. Больш 20 пунктаў уносіцца, як наказ у далейшай працы савету. Тут і папраўка дарог, студняў, тратуараў, землеўпарадкаваньне, поўнае выкананьне падатку, страхоўкі, падняцьце працы школы, КСУ, камісій пры с-савеце і шмат іншага. Кожны пункцік абгаварваецца ўсебакова і ўносіцца тады, калі ён рэальны і неаб ходны.

Так актыўна, клясава сьвядома лядчане абгаварылі справаздачу савету і ўзяліся за абгаварэньне кандыдатур у новы склад савету, каб выштырхнуць адтуль варожы ім элемент--кулацтва.

Я. К.

Лагойскі райён, Меншчына.

ПРЭЧ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ!

Праца разьвінулася.

(Полаччына).

Месячнік «За грамату» на акрузе даў вельмі добрыя вынікі. Было праведзена 150 дакладаў, на якіх прысутнічала каля 11700 асоб. У кампаніі прымала актыўны ўдзел 40 адказных таварышоў, якіх АК КП(б)Б накіраваў па вёсках на два тыдні.

На працягу месячніка арганізавана 75 ячэек «Прэч няпісьменнасьць», з лікам 2384 сябры, у выніку чаго арганізацыя павялічылася да 133 яч. з 3682 сябрамі.

Гарадзкая арганізацыя павялічылася в 1 яч. з 53 чал., да 11 ячэек з 603 сябрамі.

Па акрузе адчынена 812 лікпунктаў, якімі ахоплена каля 9625 няпісьменных, у тым ліку грамадзкіх лікпунктаў 182 з ахопам 2635 няпісьменных. Школ малапісьменных адчынена 42 з 980 вучнямі.

Сабрана 1350 руб.

У большасьці райёнаў былі праведзены тэрміновыя курсы па падрыхтоўцы ліквідатараў, якімі было ахоплена| больш 150 чал. Гэтыя курсы абслугоўвала вясковае настаўніцтва.

Асабліва прыходзіцца адзначыць працу Полацкага педтэхнікуму. Калектыў настаўнікаў педтэхнікуму прыняў на сябе агульнае метадычнае кіраўніцтва працай па ліквідацыі няпісьменнасьці ў горадзе. Студэнцкія арганізацыі выдзелілі для правядзеньня працы па ліквідацыі няпісьменнасьці 110 курсантаў 3-х старэйшых курсаў, далкам прыняўшы на сябе абслугоўваньне найбольш моцнага саюзу будаўнікоў, па якому няпісьменныя ахоплены на 100 проц.

Лестэхнікум арганізаваў на вёсцы некалькі лікпунктаў.

Сьпір. Міхальцоў.

Плян ліквідацыі няпісьменнасьці пад пагрозай зрыву.

(Гомельшчына).

Чачэрскі райён, якому па пляну трэба ахапіць навучаньнем 1040 няпісьменных і 180 малапісьменных, мае ўсе магчымасьці дзеля выкананьня пляну: па рэйёну налічваецца 104 настаўнікі, ёсьць дзьве школы ўзвышанага тыпу — чачэрская школа II ступ. і палеская школа сялянскае моладзі, камсамольская арганізацыя змагла-б сваімі сіламі ахапіць сотню—другую няпісьменных; мясцовыя сельгасрабочых, савгандальслужачых, медсанпрацы, арцелі як сельска-гаспадарчыя, гэтак і саматужна-прамысловыя, камуны, калгасы, спажывецкія таварыствы і іншыя грамадзкія арганізацыі, праявіўшы ў гэтым напрамку ініцыятыву, змаглі-б аказаць вялікую дапамогу ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці па райёну.

Як бачым, сіл хапае. Бяда толькі ў тым, што гэтыя сілы яшчэ не зварушаны належным чынам. Яшчэ да гэтага часу не афармілена райённае таварыства «Прэч няпісьменнасьць", няма яснасьці ў сетцы ўстаноў ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, дзеля чаго арганізатары лікпунктаў сталі на шлях укамплектаваньня іх малапісьменнымі(па 16 лікпунктах налічваецца 215 няпісьменных, і 299 малапісьменных), райком сельгасрабочых нічагутка не зрабіў у справе ахопу членаў саюзу і батракоў. Зусім яшчэ ня выканана дырэктыва аб поўным ахопе навучаньнем няпісьменных членаў калгасаў, сельска-гаспадарчых арцеляў, дэлегатак, дапрызыўнікаў, парабкоў, сельгасрабочых, членаў калгасаў, камун і сельска-гаспадарчых арцеляў яшчэ не ахвяцьцёўлена поўнасьцю?

Толькі неўважлівымі адносінамі да гэтага пытаньня, толькі ўскладаньнем гэтае шырокае працы выключна на плечы райённага інспэктара нарасьветы і можна тлумачыць памянёныя зьявы.

Патрэбны рашучыя крокі, сьмелыя захады, каб зьліквідаваць становішча, якое стварылася ў Буда-Кашалёўскім і Чачэрскім райёнах.

Райвыканкомам належыць зараз-жа праверыць ход працы па разгортваньню сеткі ўстаноў ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, зварачаючы належную ўвагу на ўдзел у гэтай справе сельсаветаў.

Безадкладна афарміць райённыя таварыствы «ПН», праз якія потым прыцягнуць да справы ліквідацыі няпісьменнасьці ўсе партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі, якія ёсьць у райёне.

Паўлюк Волат.

„Нічога не ахвяравана".

(Пухавіцкі р., Менскай акр.).

Пухавіцкі райсавет т-ва «ПН» яшчэ ў верасьні месяцы разаслаў усім с.-с. і хатам-чытальням падпісныя лісты на збор грошай дзеля ўзмацненьня сродкаў т-ва «ПН».

Што-ж атрымаў райсавет т-ва «ПН» да гэтага часу?

Чатыры падпісныя лісты на суму 10 руб. 95 кап. і тры лісты без усялякай падпіскі.

А трэба сказаць, што ў Пухавіцкім РВК ёсьць 16 с.-с. і 8 хат-чытален, а разам гэта складае 24 установы, якія павінны былі зьвярнуць увагу на гэту важную справу.

Некаторыя с.-с. з нейкім сарказмам адказваюць: зварочваецца падпісны ліст, нічога ня зроблена" (Навасёлкаўскі с.-с.), або „абход зроблен, але нічога не ахвяравана» (Гараліцкі с.-с.).

А дазвольце запытаць: чаму-ж самі сельсаветчыкі не падпісаліся дзеля прыкладу?

Калі мы і ў далейшым так нядбайна будзем адносіцца да гэтай вельмі важнай справы, то ня хутка мы пераможам няпісьменнасьць.

І. Дубок.

Камсамол адстаў.

(Рагачоўскі р., Бабруйшчына).

Па райёне з 1 лістапада пачалі сваю працу пункты па зьнішчэньню няпісьменнасьці, якія арганізаваны пры кожным сельсавеце, школе і г. д. Зьнішчэньне няпісьменнасьці больш ідзе за сродкі дзяржавы, але райсавет «Прэч няпісьм.» і іншыя грамадзкія арганізацыі таксама прымаюць удзел у зьнішчэньні няпісьменнасьці. Па саюзе працаўсьветы ёсьць пастанова, што кожны настаўнік павінен навучыць 5 чалавек у парадку грамадзкай нагрузкі.

Камсамол адстае ад гэтай важнай справы, некаторыя ячэйкі ЛКСМБ нават не абмеркавалі як прыняць удзел у гэтай справе.

Лікпункты, якія распачалі працу, слаба забясьпечаны падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

У лікпунктах больш усяго вучыцца моладзь ад 15 да 20 гадоў. Ёсьць лікпункты, дзе навучаюцца толькі адны сялянкі. Напрыклад, у В. Крушынаўскім лікпункце вучыцца 40 сялянак ад 14 да 26 год. Заняткі для якіх праводзяцца выключна ў сьвяточныя вечары, бо ў будныя дні яны ня могуць адарвацца ад хатніх спраў.

З боку РВК прыкмячаецца «эканомія» па зьнішчэньні няпісьменнасьці, а гэта, бязумоўна, адаб'ецца на выкананьні пляну зьнішчэньня няпісьменнасьці.

Я. Крушына.

Толькі агульнымі сіламі пераможам.

(Тураўскі р., Мазыршчына).

Яшчэ загадзя, згодна прапановы райінспэктара, вясковыя настаўнікі зрабілі падлік няпісьменных па Тураўскім райёне.

Няпісьменных па Тураўскім райёне налічваецца 4262 чал. узростам ад 12 да 35 гадоў. Большасьць няпісьменных прыпадае на долю жанчын.

Райінспэктар склаў плян правядзеньня ліквідацыі няпісьменнасьці і адчыненьня школ малапісьменных па райёне з 1928-29 па 1934-35 г. г., копіі пляну разасланы па ўсіх сельсаветах райёну.

Сеткавыя лікпункты будуць існаваць у працягу трох гадоў з такім разрахункам, каб за гэтыя тры гады яны ахапілі і выпусьцілі ўсіх няпісьменных згодна вучоту.

У 1928-29 г. будзе адчынена па райёну 53 сеткавыя лікпункты з колькасьцю няпісьменных 1438 асоб. У 1929-30 г. будзе адчынена 54 лікпункты з колькасьцю няпісьменных 1487 асоб і ў 1930-31 г. будзе адчынена 49 лікпунктаў, якія павінны будуць канчаткова ліквідаваць няпісьменнасьць. Школ малапісьменных па райёну будзе адчынена ў 1928-29 г. дзьве. Іх за працяг з 1929-30 году уключна па 1934-35 г.—6 школ малапісьменных.

Райінспэктар у кожную школу прыслаў інструкцыі і праграмы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Адная, поўнасьцю выканаць плян ліквідацыі няпісьменнасьці, складзены райінспэктарам, будзе вельмі цяжка з тае прычыны, што вынікі мінулых гадоў ужо нам паказалі, колькі лікпункты выпускаюць вучняў. Для таго, каб выканаць плян ліквідацыі няпісьменнасьці, неабходна кожнаму настаўніку штодзённа весьці працу па азнаямленьню працоўных з задачамі ліквідацыі няпісьменнасьці. Таксама неабходна арганізаваць у кожнай вёсцы яч. «Прэч няпісьменнасьць», уцягнуць у гэту працу пабольш сялян і даручаць больш пісьменным і актыўным індывідуальна праводзіць працу з няпісьменнымі пад кіраўніцтвам настаўніка.

Толькі агульнымі сіламі мы зможам у хуткім часе зьнішчыць няпісьменнасьць.

Асьветнік.

ПАДВЫШЭНЬНЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ І С.-Г. КААПЭРАЦЫЯ

Сыстэма с.-г. кааперацыі зьяўляецца адной з асноўных арганізацый, якая павінна практычна займацца справай падвышэньня ўраджайнасьці, і на яе ў даных адносінах лажыцца вялікая адказнасьць.

Каб с.-г. кааперацыя магла з поспехам выконваць гэта, яна павінна ўяўляць, што трэба рабіць і належна да гэтага падрыхтавацца.

Галоўным, што павінна праводзіць с.-г. кааперацыя, зьяўляецца наступнае:

Першае—**машынізацыя сельскай гаспадаркі.** Што апрацоўка глебы машынай значна навышае ўраджайнасьць,--справа вядомая. Тут для прыкладу можна прывесьці розныя плугі, радковую сеялку, якая ня высушвае глебы і патрабуе менш насеньня на гэктар і г. д.

Адсюль задача—даць сельскай гаспадарцы магчыма больш машын і прыладаў адпаведнай якасьці. Справа паконт колькасьці і якасьці машын пераважна залежыць ад нашае прамысловасьці. Але-ж, каб прамысловасьць ведала, колькі і якіх машын патрэбна сельскай гаспадарцы, с.-г. кааперацыя павінна выявіць і паведаміць аб гэтым прамысловасьць, а пасьля атрыманыя машыны прасунуць у вёску.

Другое, што трэба зрабіць у забясьпечаньні машынамі, гэта павышаць у агульным пляне машынаснабжэньня процант машын агрыкультурнага значэньня: культурных плугоў, сеялак, трыераў, сартыровак і г. д. Гэтыя машыны даюць большую эфэктыўнасьць, а адсюль вынік: с.-г. кааперацыя павінна быць ня толькі перадатчыкам машын селяніну, а і даказаць селяніну, якая машына больш адпавядае нашай сельскай гаспадарцы.

Другая асноўная задача ў працы с.-г. кааперацыі па падняцьці ўраджайнасьці—насенная справа. Пасеў ачышчаным насеньнем можа, як гэта сьведчыць агранамічная практыка, павысіць ураджай да 20 проц., а пасеў гатунковым насеньнем — яшчэ больш.

А таму ачыстку насеньня трэба весьці больш рашучым тэмпам, чым гэта было да апошняга часу. Калектыўныя гаспадаркі і машынныя таварыствы абавязкова павінны набыць поўны камплект збожжаачысных машын, каб задаволіць у гэтых адносінах усіх сваіх пайшчыкаў.

Там-жа, дзе збожжаачысных машын у дастатку, трэба ставіць пытаньне так, каб чысьцілі насеньне не паасобныя сялянскія двары, а выносіць пастанову на сходах вёсак і цэлых вобчастваў, каб ніводнага пуда зярна не папала ў глебу без ачысткі, і за парушэньне гэтых пастаноў устанаўляць адказнасьць.

Пытаньне аб снабжэньні гаспадарак гатунковым насеньнем упіраецца ў недахоп яго, а таму рэч ідзе аб большым разгортваньні насеннаводнай справы. Па нашай думцы, трэба пераглядзець практыку нашай працы па дастаўцы насеньня і не дапускаць, каб гатункова-насенны матар'ял раскідваўся па акрузе, інакш кажучы зьнішчыць «ураўніляўку», бо пры такім спосабе распаўсюджваньня гатункова матар'ялу ён засьмечваецца, мяшаецца са звычайным насенным матар'ялам і траціць сваю якасьць гатунковага матар'ялу.

Праца з гатунковым насеньнем павінна весьціся гнёздавым парадкам, дзеля чаго трэба браць у акрузе некалькі вёсак ці вобчастваў і тут весьці насычэньне гатунковым матар'ялам да поўнага пераводу ўсіх сялянскіх двароў на пасеў гатунковым насеньнем.

Пры гэтым спосабе ня будзе засьмечаньня гатунковага насеньня; мы будзем мець райёны з чыста гатунковымі пасевамі, адкуль у далейшым магчыма будзе браць гатунковы матар'ял для распаўсюджваньня.

Трэцяя галіна працы кааперацыі па падняцьню ўраджайнасьці—**кантрактацыя пасеваў.** Гэта мерапрыемства ўзьдзейнічае на сельскую гаспадарку як у адносінах узьняцьця ўраджайнасьці, так і ў сэнсе магчымасьці поўнай яе рэарганізацыі. Кантрактацыя ў 1928 г. ахапіла каля 70000 гаспадарак, а на будучы год мяркуецца ў гэту працу ўцягнуць каля 100000 гаспадарак.

Праводзячы гэту працу ў мінулым годзе, мы не зрабілі кантрактацыі рэарганізуючым пачаткам у сельскай гаспадарцы, бо мы яе праводзілі, не патрабуючы з боку сялянства амаль ніякіх абавязкаў агрыкультурнага зьместу. У далейшай нашай працы па кантрактацыі пасеваў трэба выходзіць ня толькі з таго, каб атрымаць ад селяніна тую ці іншую сыравіну, а трэба ставіць пытаньне так, каб селянін на грошы, якія мы яму адпускаем, здаў поўнасьцю прадукцыю па дагавору. Разам з гэтым, нам трэба абавязваць пасеўшчыкаў па дагавору выконваць у сваёй гаспадарцы шэраг мерапрыемстваў наогул па ўсёй гаспадарцы, якія-б вялі да павышэньня ўраджайнасьці.

Дзякуючы кантрактацыі, шляхам заключэньня ўмоў з цэлымі насельнымі пунктамі, мы зможам ужыць усе тыя мерапрыемствы, якія вядуць да павышэньня ўраджайнасьці.

Вялікую ролю ў справе падняцьця ўраджайнасьці павінна адыгрываць **малочная прамысловасьць.** Арганізаваная ў райёне малочная арцель выклікае неабходнасьць увядзеньня ў гаспадарку пасеўных траў, устанаўленьне правільнага севазвароту, а, як вядома, правільны севазварот вядзе да падвышэньня ўраджаю.

Але да гэтага часу ў галіне малочнай справы і асабліва жывёлагадоўлі кааперацыяй зроблена надзвычайна мала. Малочных заводаў і пунктаў мы ўжо пабудавалі многа, але яны амаль усе ня маюць поўнай нагрузкі. А справа ў тым, што да апошняга часу малочная кааперацыя будавала сваю працу, калі так можна сказаць, на беднасьці сялянскай гаспадаркі, гэта значыць на дастаўцы малака беднай гаспадаркай ад дрэннай каровы.

Трэба справу арганізаваць так, каб селянін меў лішку малака—на збыт. А гэтага магчыма дасягнуць толькі пры колькасным і асабліва якасным павялічэньні жывёлы пры паляпшэньні гадоўлі жывёлы і догляду за ёю.

Бясспрэчным зьяўляецца пытаньне аб буйным значэньні ўжо існуючых калгасаў, а таксама і калектывізацыі вёскі наогул у сэнсе падняцьця ўраджайнасьці. Тут трэба зрабіць дзьве асноўныя ўстаноўкі: папершае, больш сьмялей пашырыць сетку буйнай калектыўнай гаспадаркі і, падругое, адразу патрабаваць ад калгасаў вядзеньня сельскай гаспадаркі пановаму з ужываньнем прыёмаў сучаснай высокай тэхнікі і агранамічнай практыкі, дапамагаючы ім у гэтай справе як з боку арганізацыі самой гаспадаркі, так і снабжэньня калгасаў сродкамі вытворчасьці.

Вось тыя галоўныя галіны працы па падняцьці ўраджайнасьці ў сыстэме с.-г. кааперацыі, на якія павінна быць накіравана як увага кааперацыйнага апарату, так і кааперацыйнай грамадзкасьці. Каб гэтыя задачы выканаць, нам трэба стала заняцца падборам кааперацыйнага апарату, бо калі цяжка падняць ураджайнасьць сярод агранамічна няпісьменнага вясковага насельніцтва, то тым больш гэту працу праводзіць, як належыць, будзе немагчыма з агранамічна непісьменным кааперацыйным апаратам. Дзеля гэтага трэба заняцца належным падборам апарату так і правядзеньнем цэлага раду курсаў для ўзьняцьця яго кваліфікацыі. Тут справа упіраецца ў некультурнасьць нашай вёскі, а мы да гэтага часу ў даным напрамку зрабілі надзвычайна мала. Сыстэма с.-г. кааперацыі павінна штогод рабіць адлічэньні на культурна-асьветную працу і на гэтыя сродкі распаўсюджваць літаратуру, газэты, часопісы, брашуры, а ў некаторых выпадках выпісваць літаратуру і для гандлю. Пры саміх жа таварыствах павінны быць арганізаваны бібліятэчкі па сельскай гаспадарцы, дзе пайшчыкі змаглі-б браць літаратуру для карыстаньня.

Аксючыц.

ЗАЎТРА на вуліцах Менску, Гомеля, Віцебску, Воршы і інш. акруговых гарадоў будуць прадаваць ГАЗЭТУ-АДНАДНЁУКУ **„КАМСАМОЛ—ШКОЛЕ“**

Грошы ад продажу газэты цалкам пойдуць на карысьць нашай працоўнай школы. Кожны рабочы і служачы, кожны настаўнік і студэнт павінны абавязкова купіць гэту газэту.

У газэце зьмешчаны артыкулы т. т. ГАМАРНІКА, М. КАЛІНІНА, ГАЛАДЗЕДА, ГАЛАВАЧА, СТАСЭВІЧА, ПІЧЭТЫ, ЛУНАЧАРСКАГА, БАЛІЦКАГА, БЯЛУГІ, КУЗЬМЫ ЧОРНАГА; апавяданьне ЗЬМІТРАКА БЯДУЛІ; вершы і байкі: КУПАЛЫ, КОЛАСА, АЛЕКСАНДРОВІЧА, КРАПІВЫ, ДЗЕРКАЧА, ГРАМЫКІ і шэраг іншых цікавых матар'ялаў.

„КАМСАМОЛ—ШКОЛЕ“ каштуе толькі 5 кап.

За ленінскую лінію ў нацпытаньні

Рэзалюцыя

АГУЛЬНАГА СХОДУ СТУДЭНТАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ КАМУНІСТЫЧНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ ІМЯ ЛЕНІНА.

Заслухаўшы інфармацыю т. Сінькевіча аб лісьце трох беларускіх пісьменьнікаў—Дудара, Заровкага і Александровіча,—які быў зьмешчан у № 278 газэты «Савецкая Беларусь» — за 4-XII г. г.—агульны сход студэнтаў і супрацоўнікаў Камвузу Беларусі сумесна з курсамі камсамольскага актыву канстатуе наступнае:

1. Выступленьне гэтых пісьменьнікаў ёсьць адбітак тых нацыянал-дэмакратычных настрояў, якія ёсьць у частцы інтэлігенцыі і якія асабліва актывізаваліся ў зьвязку з узмацненьнем наступу на капіталістычныя элементы ў краіне і завастрэньнем клясавае барацьбы.

2. Аўтары ліста ня хочуць зразумець, што толькі Бастрычнікавая рэвалюцыя дала магчымасьць усім нацыянальнасьцям Савецкага Саюзу вызваліцца ад прыгнечаньня і разьвіваць нацыянальную культуру.

3. Разьвіцьцё нацыянальнай культуры ідзе і павінна ісьці па руслу нацыянальнае па форме і пралетарскае па зьместу. Аўтары ліста Заровкі, Александровіч і Дудар, а разам з імі і Глыбоцкі ў сваіх выступленьнях і артыкулах імкнуцца да іншай, чуждай пралетарыяту культуры, імкнуцца нацыянальныя формы культуры запоўніць буржуазным, а не пралетарскім зьместам.

4. Існаваньне вышэйшых вучэбных устаноў Беларусі сьведчыць аб культурных і гаспадарчых дасягненьнях Беларускай Сав. Сац. Рэспублікі. Аўтары ліста навялі паклёп на гэту ўстанову, даючы гэтым зброю ў рукі нашых ворагаў. Усё чэснае, уся савецкая грамадзкасьць павінна даць рашучы адпор падобным выступленьням як аўтараў ліста, таксама і артыкулаў аб самабытнасьці, якое вядзе да разьяднаньня шэрагу працоўных нашага Саюзу, даць рашучы адпор гэтым арыентацыям на Захад.

5. Партыя не дазволіць развіцьці сваёй генэральнай лініі ў нацыянальным пытаньні. Толькі выкананьне гэтай лініі, у прыватнасьці, правядзеньне ўзмоцненым тэмпам беларусізацыі, забясьпечыць далейшае росквіт беларускай культуры нацыянальнай па форме з пралетарскім зьместам, забясьпечыць далейшае ўзмацненьне інтэрнацыянальнай салідарнасьці народаў СССР.

За ленінскую, вытрыманую, бальшавіцкую лінію ў нацпытаньні.

Незаможныя сяляне Украіны вітаюць рабочых і сялян БССР.

Учора дэлегацыя сялян-незаможнікаў Украіны ў складзе 5 чалавек выехала на Украіну.

Перад ад'ездам дэлегаты падзяліліся ўражаньнямі аб выніках сваёй экскурсіі ў БССР.

— Мы, кажа селянін тав. Тэсьля, прыехалі ў Менск 4 сьнежня і ў гэты-ж дзень знаёміліся з горадам. Пабывалі ў новым Цэнтральным Доме Селяніна, які нам вельмі спадабаўся; асабліва ўражаньне на нас зрабіў музэй пры Доме Селяніна, які, па нашай думцы, дапаможа падняць культуру сельскай гаспадаркі.

— Мы, кажуць дэлегаты, бачым, як савецкая ўлада клапоціцца аб беднаце, выводзіць яе на лепшы шлях.

— 5 сьнежня разам з аграномам мы аглядалі птушніцкі завод, які знаходзіцца на акраіне гораду. На заводзе мы бачылі шмат цікавага і зараз ведаем, што птушка ў гаспадарцы можа даць вялікую карысьць. Пабывалі ў гэты дзень і ў савгасе імя Калініна. Рабочыя савгасу сустрэлі нас вельмі ветліва і паказалі свае дасягненьні. Нам вельмі спадабалася племянная жывёла, асабліва малочная.

За час прабываньня ў Менску дэлегаты наведалі шэраг заводаў і фабрык. На заводах «Бальшавік» і «Энэргія» сяляне-украінцы былі спатканы рабочымі; агляд'зелі вытворчасьць.

— Мы, кажа т. Тэсьля, бачылі на заводах, што праца рабочага вельмі цяжкая, і што рабочыя працуюць «не за страх, а за совесьць», для таго каб забясьпечыць селяніна патрэбнымі яму таварамі прамысловасьці.

Агледзелі дэлегаты і домік, дзе адбыўся першы зьезд партыі бальшавікоў, а таксама хлебазавод. Наведалі украінцы «халадзільнік» і шэраг іншых прадпрыёмстваў Менску.

— Мы бачым, што ўсюды ідзе шпаркім тэмпам будаўніцтва, і ўсё гэтае робіцца на карысьць працоўных.

— Цяжка беларускаму селяніну працаваць над зямлёй, бо яна кепская, —кажа дэлегат Русоў,—але сялянскай беднаце трэба ісьці ў калгасы, бо толькі калектыўная працай у калектыўнай гаспадарцы беднота зможа палепшыць сваё жыцьцё.

— Трэба яшчэ шчыльней наладзіць сувязь гораду з вёскай, бо толькі агульнымі сіламі рабочых і сялян усіх нацыяў пад кіраўніцтвам партыі мы зможам прыйсьці да сьветлай будучыні,—кажа селянін Надарожны.

Праз газэту „Савецкая Беларусь» выносім чаша шчырае дзякуй савету прафсаюзаў Беларусі' які пайшоў нам насустрэчу пры азнаямленьні з жыцьцём і будаўніцтвам Беларусі.

— Ад імя незаможных сялян Украіны просім праз вашу газэту перадаць наша братэрскае прывітаньне рабочым і сялянскай беднаце Беларусі і жадаем яшчэ большых посьпехаў у галіне сацыялістычнага будаўніцтва,—заявілі ўсе, як адзін, сяляне-украінцы.

ХРОНІКА.

На нарадзе рабочай каапэрацыі.

Гэтымі днямі закончылася ўсебеларуская арганізацыйная нарада Белрабсэкцыі.

На нарадзе быў абгавораны шэраг пытаньняў, зьвязаных з паляпшэньнем працы ў рабочай каапэрацыі БССР.

Галоўная задача, якая зараз стаіць перад рабочай каапэрацыяй, гэта вышэйшэньне чаргі ў каапэратывах. Для гэтага навінна быць павышана кваліфікацыя служачых, пашырана сетка крам і г. д.

На нарадзе таксама пастаноўлена прыняць меры да ўцягненьня ў каапэрацыю рабочай моладзі, якой будзе давацца магчымасьць на працягу доўгага часу выплачваць свой пай.

Моладзь, якая зарабляе да 25 руб. у месяц, зможа выплаціць свой пай на працягу 2-х гадоў, ад 25 руб. да 50 руб.—на працягу 18 месяцаў, ад 50 руб. да 75 руб.—12 месяцаў і вышэй—у 6 месяцаў.

Таксама пастаноўлена прадпісаць моладзі крэдыт тэрмінам на 6 месяцаў. Будзе ўведзен зусім новы крэдыт на музыкальныя інструманты, спартыўны інвэнтар і вучэбныя прылады.

Ва ўсіх буйных магазынах будуць арганізаваны для абслугоўваньня рабочай моладзі аддзяленьні „Усё для рабочай моладзі“.

Нарада выказалася за пераход віцебскага каапэрацыйнага тэхнікуму ў Менск.

Нарада таксама выказалася за хутчэйшы пераход на дыфэрэнцыраваны пай (пай у залежнасьці ад зарплаты).

Часова да пераходу на новы дыфэрэнцыраваны пай нарада пастанавіла ўстанавіць пай ў 25 р., а для мізкааплачваемых груп—20 руб.

Выдача прадуктаў з крам МЦРК.

18 сьнежня па крамах Менскага ЦРК будзе праводзіцца выдача пайшчыкам пшанічнай мукі па 1 з пал. кілё на едака, падсонечнага алею па паўлітра і селядцоў па 1 кілё на кніжку.

Штодзень будзе адпускацца 12.000 пайшчыкаў па парадку нумароў кніжак. Па квітанцыях аб згубе каапэрацыйных кніжак прадукты будуць выдавацца ў апошнюю чаргу.

Павялічана таксама норма водпуску крупы: замест ¾ кілё будзе штомесяц выдавацца па 1 кілё на едака.

Выплата выйгрышаў.

Беларуская Кантора Дзяржбанку за 5 дзён выплаціла па аблігацыях пазыкі індустрыялізацыі 143 выйгрышы на 6.584 руб., у тым ліку па выйгрышах галоўнай ашчаднай касы БССР—52 выйгрышы на 2.042 руб. 95 кап. Сярод выйгрышаў ёсьць 4 аблігацыі па 250 руб. і 21 аблігацыя—па 100 руб.

Па 9-м тыражу пазыкі 1926 г. выплачана 16 выйгрышаў на 1000 руб.

Пабудова паказальнага дому для бяспрытульных.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР распачала падрыхтоўку да закладкі ў дні сьвяткаваньня 10-гадзьдзя агалашэньня БССР у Менску паказальнага дому для бяспрытульных. Будзе пабудавана спэцыяльнае памяшканьне, у якім будуць размешчаны інтэрнат, станцыя і майстэрня. На пабудову гэтага паказальнага дому будзе выдзелена каля 100.000 руб.

АБ СЫМФАНІЧНЫХ КАНЦЭРТАХ.

У панядзелак, 10 сьнежня, у клюбе саўгандальслужачых мае адбыцца штотыднёвы чарговы (трэці па ліку) сымфанічны канцэрт пад кіраўніцтвам дырыжэра І Бел. Дзярж. Тэатру М. В. Міхайлава.

Аркестр складаецца з 42 асоб лепшых музычных сіл Менску, як арэстрантаў і салістаў-інструменталістаў (Басьсьмертны, Шальт і інш.) так і вядомых салістаў-сьпевакоў (Востокаў, Васільчэнка, Александроўская). Праграма канцэртаў разнастайная і цікавая. Кіруе аркестрам таленавіты, высока-асьвечаны і тонкі мастак М. В. Міхайлаў.

Усё гэта можа сьведчыць аб вялікай мастацкай каштоўнасьці гэтых канцэртаў і аб тым посьпеху, якім карысталіся папярэднія канцэрты і якім яны, бязумоўна, будуць карыстацца і надалей.

Але, нажаль, прыходзіцца адзначыць некаторае незадоволеньне на вусіх удалым абслугоўваньнем канцэртамі шырокага слухача. Справа ў тым, што канцэрты ставяцца ў клюбе саўгандальслужачых і, як абвяшчае афіша, білеты на канцэрты атрымліваюць члены гэтага саюзу і члены іхняга-ж клюбу. Пры многалюднасьці саюзу саўгандальслужачых і параўнальна невялікай залі іхняга клюбу в абмежаванай колькасьцю месц не застаецца білетаў для продажу членам іншых саюзаў, і патранціць на канцэрт «іншасаюзнаму» ам ль немагчыма пры самым гарачым жаданьні. Лёзунг: «Мастацтва—працоўным» патрабуе, каб мастацкае выхаваньне было здабыткам усіх без выключэньня працоўных, асабліва тых працоўных, якія ў гэтым выхаваньні адчуваюць найбольшую патрэбу. Тут я разумею індустрыяльныя прафсаюзы.

Бязумоўна, культадзел саўгандальслужачых арабіў вельмі добрую карысную справу, наладзіўшы гэтыя канцэрты ў сваім клюбе для сваіх членаў, але шкода, што, папершае, канцэрты абхопліваюць толькі адзін прафсаюз, гэта значыць, толькі невялікую частку нашага прафсаюзнага слухача, а, падругое, што думку культадзелу саўгандальслужачых аб наладжаньні канцэртаў не скарыстаў раней і ў больш шырокім, усеагульным прафсаюзным маштабе. Культадзел ЦСПСБ для абслугоўваньня ўсіх саюзаў шляхам арганізаванага разьмеркаваньня білетаў на ўсіх саюзах, скарыстаўшы для гэтае мэты больш умяшчальнае і адпаведнае памяшканьне, напр., залю кіно „Культура“, клюб Карла Маркса, альбо залю Бел. Дзярж. Тэатру, якая бывае вольнай па панядзелках і магла-б быць вольнай іншы тыдзень і на аўторках.

Калі-б гэта можна было правесьці ў жыцьцё, дык, гэта, ня кажучы ўжо аб вялікай выхаваўчай ролі падобных канцэртаў, дало-б магчымасьць павялічыць як склад аркестру, так і лік салістаў інструменталістаў і сьпевакоў.

М. Н—іч.

Менскі дзень.

— Сяўзавачны стол арганізуецца ў бліжэйшы час пры фонавачым аддзеле Усебеларускай канторы Дзяржбанку. Справачны стол будзе даваць бясплатна розныя справкі на ўсіх тыражох пазык.

— Спэцыяльны сход навучовых працаўнікоў, прысьвечаны 25-гадзьдзю юбілею пісьменьніка Цішкі Гартнага, пастановлена склікаць у бягучы месяц. На сходзе абдумуцца даклады прафэсароў БДУ Піотуховіча і Вазьнясенскага.

— Арганізаваў камітэт 3-ай усебеларускай мастацкай выстаўкі, прысьвечанай і 10-гадзьдзю агалашэньня БССР. У склад камітэту ўваходзяць прадстаўнікі ад Галоўмастацтва, Белдзяржмузэю, саюзу прадпрыемстваў, прадкалектыву пацаўнікаў і Усебеларускага аб'яднаньня мастакоў.

— Мастацкая рада арганізавана пры беларускім Дзяржаўным вандроўным тэатры Галубка. У склад мастацкай рады ўваходзяць 12 чал., у тым ліку прадстаўнікі ад рабочых.

Падрыхтоўка да 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР.

Менскі акругком Моп'р'у сумесна з ЦК Моп'р'у выдаюць да 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР спэцыяльную ашчадзённую газэту, прысьвечаную дасягненьням Моп'р'у БССР за 5 год свайго існаваньня. Тыраж газэты—15-20 тысяч.

Ячэйкі Моп'р'у рыхтуюць да сьвята спэцыяльныя платныя пастаноўкі на карысьць палітвязьняў.

На дапамогу палітвязьням.

Зімовая кампанія дапамогі палітвязьням рассчана разгортвацца. З Гомельскай акругі ўжо паступіла звыш 6000 руб. Па Менску таксама ўжо сабрана каля 1000 рублёў.

Саюз сельска-гаспадарчых і лясных рабочых зьвярнуўся з лістом да ўсіх мясцкомаў аб саўдзельнічаньні ячэйкам Моп'р'у на мясцох у правядзеньні гэтай кампаніі. З такім лістам зьвярнуўся таксама да мясцкомаў г. Менску саюз працаўнікоў мастацтва.

Выданьне музычных твораў.

На днях пры Галоўмастацтве адбылася нарада па пытаньні аб выпуску музычных твораў. Маркуецца ў першую чаргу заадаволіць музычнымі зборнікамі школьныя хоры на 2—3 галасы.

Будзе таксама выпушчана музыкальна-хрыстаматыя і інш. музычныя творы. Апрача гэтага, будуць выпушчаны аркестравыя творы (квінтэт Аладава і сюіта Рагоўскага).

Электрыфікацыя мястэчак.

Менскае аддзяленьне Дзяржаўнага Электратэхнічнага трэсту зараз праводзіць электрыфікацыю некалькіх мястэчак Менскай акругі. У Каўлы ўстанаўліваецца электрастанцыя, магутнасьцю ў 40 кілёват, у Заслаўлі—электрастанцыя—у 23 кілёват і ў Плешчаніцах—электрастанцыя—у 28 кілёват. Гэтыя электрастанцыі дадуць ток таксама прадпрыёмствам, якія знаходзяцца ў гэтых мястэчках. У лютым-сакавіку месяцы гэтыя электрастанцыі будуць пушчаны ў ход.

Барацьба з антысанітарыяй.

У бліжэйшыя дні ў Менску распачнецца 2-хтыдзёвік па барацьбе за чыстату.

На працягу гэтага часу спэцыяльнай камісіяй з удзелам санітарных дактароў, міліцыі, камгасу, будзе праведзен агляд усіх домаўладаньняў Менску, з мэтай высьвятленьня іх санітарнага становішча.

За антысанітарыю будзе накладацца штраф.

З СЁНЬНЕШНІМ НУМАРАМ ГАЗЭТЫ РАССЫЛАЕЦЦА ЧАРГОВЫ (15) НУМАР ДАДАТКУ „ПРАЦАЎНІК АСЬВЕТЫ“.

Асушаем балоты.

Зараз на абшарах БССР знаходзіцца каля 1000 мэліярацыйных т-ваў, якія зайнаюцца асушкай каля 170 тысяч гэкт. балот. Гэтымі т-вамі ахоплена звыш 60 тысяч сялянскіх двароў. Да гэтага часу мэліярацыйныя т-вы асушылі і ўтварылі 5500 гэкт. і экспэрыментуюць—51 тыс. гэкт. балот.

У 1928-29 г. мяркуецца арганізаваць яшчэ 100 мэліярацыйных т-ваў. Па плану прадбачыцца правядзеньне значнай працы па ўпарадкаваньню асушаных балот: выцерабіць хмызьняк на 13400 гэкт., зрэзаць куп'ё на 3600 гэкт., узараць 3800 гэкт., заняць папярэдніх культурамі 3600 гэкт., зрабіць штучнае залужэньне на 650 гэкт., арганізацыя штучных выгонаў на 350 гэкт., папярхоўнае палепшаньне 3000 гэкт., засеяць канаплёй 1000 гэкт.

На культур-тэхнічныя справы на наступны год па плану мяркуецца наступныя выдаткі: 400 тысяч руб. крэдытаў, 1100000 руб. уласных сродкаў насельніцтва і па дзяржаўнаму бюджэту—202 тыс. руб.

Вялікая ўвага будзе зьвернута на мэханізаваньне працоўкі балот. Будуць створаны трактарныя калёны, будуць набыты глеба-фрэзы. Сёлета працавалі 22 трактары, на лета будуць заняты на асушаных балотах яшчэ 20 трактараў.

Паштовая скрынка.

Крушыну „Самакрытыка не кампанія“ ня пойдзе. Треба пісаць канкрэтныя факты бюракратызму.

Б. Дзаргу «Добрае і кровавае» ня пойдзе.

Клебанову «Шэф» — накіравана ў Барысаўскі горрайком КП(б)Б.

А. Т. «Чыгуначная математыка» накіравана ў праўленьне Зах. чыгункі і адбітку ЦКК РСІ.

Райвіаву „Асеньняя сяўба“ ня пойдзе. Треба даваць факты, а не агульныя разважаньні.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня а 7 гадз. пасяджэньне францыі праўленьня дому.

— А 7 гадз. увеч.—агульны сход клюбных упаўнаважаных Дому Асьветы.

— У памянканьні чытальні адбудзецца лекцыя тав. Тэніна—«Сучасная літаратура і культурная рэвалюцыя».

Бібліятэка-чытальня 9-XII адчынена да 8 гадз. увечары.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Нядзеля, 9 сьнежня ДЛЯ ПРАЦАЎНІКОЎ МЕНШВЭЮ.

„БРОНЕЦЯГНІК 14-69“.

Пачатак роўна а 8 гадз. увечары.

Пасьля 3-га сыгналу ўваход у відоўню зачынен.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Нямецкі баявік „МАРАЛЬ“ у 6-ці частках „МОСТ ПРАЗ ВЫПЬ“ у 6-ці частках. Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 45 хв.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. З аўторка 4 сьнежня „ДАЧКА РАФКЕ“ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: гастролі сатырыка СЯРГЕЯ ВРОНСКАГА. З сэансы: пач. 1-га ў 7 г.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». АПОШНІЯ ТРЫ ДНІ 7, 8 І 9. 2 сэрыі 14 частак у адзін сэанс сэрыі 2. „Паміж жыцьцём і сьмерцю“.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». „ЗАЛАТЫ МЁД“ Звыш праграмы кіно-хроніка «Совкино». Пачатак сэансаў а 3 з пал. гадз. увечы.

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ СВАЕЧАСОВА ПАДПІСАЦЦА НА ГАЗЭТУ „Савецкая Беларусь“ на 1929 год.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА на двухнедельный журнал „КОЛЛЕКТИВИСТ“ на 1929 год

орган Всесоюзного Совета и Всероссийского Союза Колхозов.

КОЛЛЕКТИВИСТ—единственный, популярный, иллюстрированный журнал, целиком посвященный строительству колхозов: с.-х. коммун, с.-х. артелей, товариществ по общественной обработке земли, машинно-тракторных и мелиоративных товариществ.

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ: на 1 год—5 руб., на 6 м.—2 р. 75 к., на 3 м.—1 р. 50 к., на 1 м.—50 к. Цена отдельного номера—25 коп.

Подписную плату направляйте: Москва—центр, Б. Дмитровка, д. № 4 1-ый этаж. Редакция журнала «КОЛЛЕКТИВИСТ».

Вышаў з друку, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж

№ 9 „ПОЛЫМЯ“ № 9

Штомесячная беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі (СЁМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ)

пад рэдакцыяй: З. ЖЫЛУНОВІЧА, Я. ВАСІЛЕВІЧА, Я. КУПАЛЫ, А. БАЛІЦКАГА, М. ЧАРОТА

ЗЬМЕСТ:

Цішка Гартны. Рыгор у Пецярбурзе (з раману „Сокі палёны“—Крыжавыя дарогі); Язэп Гора. Сьмерць мужа і жонкі Гіводавых (апавяданьне); Л. Радзевіч. Нягодная (апавяданьне) Андрэй Курці (Куршыноні) Пракурор Нат (апавяданьне); Н. Вішнеўская. Завея (апавяданьне); Я. Колас. На шляхох волі (паэма); А. Александровіч. Разбойнік Буйтро (верш); І. Бэхэр. Вялізарнае абжорства (верш); Паўлюк Трус. Ліст да сястры (верш); Валеры Маракоў. Ёй адчыніў вакно (верш); Прэф. С. Вальфсон. Аб Чэрнышэўскім—рэвалюцыянэры і мысьліцелі; І. Герчыкаў. Філёзафскія ды гістарычныя погляды М. Г. Чэрнышэўскага; Праф. Зьм. Жарынаў. Прыгонная гаспадарка Беларусі паводле дэмых расійскай гаспадарчай літаратуры і журналістыкі 30-40 гадоў (канец); Праф. І. Замецін. Драматычныя творы Цішкі Гартнага; Ул. Дзяржынскі. Дзейнасьць З. Жылуновіча ў абсягу беларускае літаратурнае крытыкі; М. Гарэцкі. Творчасьць маладнякоўцаў: А. Моркаўкі і Я. Ліманоўскага; Л. Цьвяткоў. Увагі ў прапанісе і скляненьні чужаземных імень. ніў у беларускай мове; Кнігапіс—В. Залуцкі, Л. О. Кіншэвіч; Хроніка беларускай культуры; Хроніка украінскага культурнага жыцьця.

Прымаецца падпіска на „ПОЛЫМЯ“ на 1929 год

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: На год . . . 12 руб. — кап. » 6 месяцаў . . . 6 » 50 » » 3 месяцы . . . 3 » 25 »

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 1 РУБ. 25 КАП.

Падпісчыкі на часопісь „ПОЛЫМЯ“, якія прышлюць цалкам падпісную плату да 25 лютага 1929 г., атрымліваюць на гэты-ж год па падпісных квітанцыях пры пакупцы мастацкай (Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага і інш.) і палітычнай літаратуры выданьняў Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва наступныя ільготы:

Гадавыя падпісчыкі атрымліваюць скідку на 25 проц. (на агульную суму да 30 р.), паўгадавыя падпісчыкі—15 проц. (на суму да 20 руб.).

Акрамя таго падпісчыкам на «ПОЛЫМЯ» на 1929 год, якія не карыстаюцца скідкай, дасцца растэрмінаваньне з УПЛАТАЮ ГАДАВЫМ: да 1 студзеня—5 р., да 1 ліпеня—4 р. і да 1 кастрычніка—3 р.

Паўгадавым падпісчыкам да 1 студзеня—4 р. і да 1 чэрвеня 2 р. 50 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У рэдакцыі часоп. „ПОЛЫМЯ“ (Менск, Савецкая 63, Белдзяржвыдавецтва), у цэнтральнай кнігарні Бел. Дзярж. Выдавецтва (Менск, вуг. Ленінскай і Савецкай), ва ўсіх акруговых аддзяленьнях Бел. Дзярж. Выдавецтва, у аддзеле падпіскі Беларускага Аддзяленьня ГІЗ'а РСФСР (Менск, Савецкая, 54) і яго агентурай на акругах і райёнах, ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і аддзяленьнях у Беларускім Аддзяленьні Выдавецтва «Известия ЦИК» і „Правда“ (Менск, Савецкая, 61) і яго пададдзяленьнямі (Гомель, Савецкая, 17; Віцебск, Ленінская 11), а таксама і контрагентамі (Бабруйск, Магілёў, Жлобін), у канторы газэты „Беларуская Вёска“ (Менск, Савецкая, 63) і не ўпаўнаважанымі і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР.

АБВЕСТКА.

СУДОВЫ ВЫКАНАЎЦА 2 ВУЧ., МЕНСКАЙ АКРУГІ, АБВЯШЧАЕ:

11 сьнежня 1928 г. а 1 гадзіне дня адбудзецца продаж з публічнага торгу будынкаў гр. МАКЕЕВА ЯНКІ і ПАЎЛІНЫ—2-х драўляных дамоў па Чычэрынскай вул. д. № 16.

Ацэнка да торгу—1200 р. на спагнаньне 230 р. у карысьць Хаміна па выканаўчаму лісту нар. суду 2 вуч. Мен. Акругі ад 9 лістапада 1928 г. за № 2001.

Таго-ж самага дня а 2 гадзіне дня адбудзецца продаж дому гр. Пугача Міхася, які знаходзіцца ў Менску па Камуністычнай вул. д. № 22. Ацэнка да торгу 700 руб., на спагнаньне 265 р. у карысьць Камунбанку на судовому загаду Нар. суду 2 вуч. М. акр. ад 16 ліпеня 1928 г.

У выпадку, калі першыя таргі не адбудуцца, паўторныя таргі назначаюцца на 28 сьнежня ў тыя-ж гадзіны, як і першы торг.

Жадаючыя прыняць удзел у таргох запрашаюцца на паказаныя гадзіны на месца знаходжаньня маемасьці да пачатку торгу. Аб сьпісах маемасьці і аб умовах продажу можна даведацца ў судовага выканаўцы штодня ад 9 да 12 гадз. дня, Пралетарская вул. д. № 15, а ў дзень продажу—на месцы торгу.

Судвыканаўца ПАНКРАТ.

НАРКАМАСЬВЕТЫ БССР ГЭТЫМ АПАВЯШЧАЕ, ШТО САВЕТ ЖУРЫ ПА РАЗГЛЯДУ КОНКУРСНЫХ ПРАЗЭКТАЎ ШКОЛЬНЫХ ТЫПАВЫХ БУДЫНКАЎ АРГАНІЗУЕ ПАПЯРЭДНЮЮ ВЫСТАЎКУ ПРАЗЭКТАЎ ДЛЯ АГЛЯДУ.

Выстаўка будзе адчынена ў будынку 27-й школы па Савецкай вуліцы, д. № 52 з 9-га па 16 сьнежня 1928 г. ключна: у будні з 10 да 12 і ад 17 да 20 гадзін; у дні адпачынку ад 10 да 17 гадзін.

Уваход вольны.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Лікавая кніжка Казлоўскай Я., выд. Барысаўскай страхкассай, кв. 230.

— Службовая кніжка № 2262 М. А., выд. Каралінскім РВК, кв. 244.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Аршанскага Таварыства Ўзаемнага Крэдыту на 1 кастрычніка 1928 г.

АКТЫЎ.

1. Каса і бягучыя рахункі	2565—17
2. Кантоўнасьці	2393—89
3. Вучот і спэц. бяг. рах. и-вэксалі	41922—22
4. Пазыкі и-кашт. паперы	50 —
5. Карэспандэнты	2264—56
6. Розныя дэбіторы	508 40
7. Маемасьць	685—15
8. Выдаткі будучых гадоў	276—94
БАЛЯНС	50666—33

ПАСЫЎ.

1. Зваротны капітал	8420 —
2. Іншы капітал і фонды	4245—70
3. Перавучот і пераваліт	2871—02
4. Уклады і бягуч. рахункі	30285—13
5. Незапатрабаваныя сумы	1234—02
6. Разьлікавыя рахункі	180 —
7. Карэспандэнты	1692—32
8. Прыбыткі будучага году	622—95
9. Рахунак прыбыткаў і страт	1114—53
БАЛЯНС	50666—33

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ НА 1 КАСТРЫЧНІКА 1928 г.

ДЭБЕТ.

1. Бягучыя выдаткі	5898—95
2. Падаткі і зборы	856—26
3. Апэрацыйныя выдаткі	4983—60
4. Амартызацыя	54—80
5. Убыткі	223—32
6. Вынікі: прыбытак за справаздачны год	1114—53
БАЛЯНС	13131—46

КРЭДЫТ.

1. Прэнты атрыманыя	10190—09
2. Камісія атрыманая	2719—09
3. Розныя выдаткі	221—28
БАЛЯНС	13131—46

Старшыня праўленьня С. І РУДАЎ.

Члены праўленьня: Л. І. ЭЙДЗІНАЎ, М. А. ХУРГІН. Бухгальтар П. В. АЛЯКСЕЙ.

Галоўлітбел 302